Надзея Артымовіч ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

МІХАСЬ ХМЯЛЕЎСКІ ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 26 (2563) Год L | Беласток, 26 чэрвеня 2005 г. | Цана 2,00 зл.

Людзі: Не стаўляйце нам тых электронных сышчыкаў, бо і без іх пра ўсё падазронае паведамляем...

Цяпер падглянуць усё

У Коматаўцах пагранічнікі былі склікалі сход насельніцтва, у час якога абнародавалі, што ў вёсцы стануць дазорныя вышкі дзеля агляду абставін вакол памежнай вёскі. Людзей ахапіў перапалох, бо ж з тых вышак не толькі будзе нейкая шкодная радыяцыя раскідацца па вёсцы, то яшчэ пагранічнікі будуць занадта падглядаць людзей.

— Бо ж кабета працуе ў агародзе, даглядае раслінкі, і бывае так, што надыдзе тая патрэба, за якою цар пехатою ходзіць, дык жа не пойдзе яна ў хату брудзіць пліткі, толькі прысядзе ціхенька пад бліжэйшы кусцік, — тлумачыць мне жыхарка Коматаўцаў.

І дагэтуль усё адбывалася згодна спрадвечнаму рытуалу, а цяпер жа могуць нейкія маладзёны, седзячы перад абвешаным экранамі пультам, усе дэталі падгледзець. І смеху нарабіць! То як цяпер мае быць: у Парыж ездзіць, каб нейкую модную бялізну купляць?

У беластоцкім тэлебачанні працуе сваячка аднаго з коматаўскіх жыхароў, дык людзі пацягнуліся і ў тэлеэфір са сваёй бядой: не стаўляйце нам тых электронных сышчыкаў, бо ж мы і без іх пра ўсё падазронае паведамляем пагранічнікам.

Стала крыху няёмка, бо размяшчэнне тых вышак ужо размеркаванае за высокімі парогамі — у Коматаўцах вышка мае стаяць! Яшчэ нядаўна не было б тут ніякай загваздкі — паставілі б і толькі. Але цяпер трэба правесці грамадскія кансультацыі і атрымаць згоду насельніцтва; дзеля таго і быў наладжаны згаданы напачатку сход. І паколькі даў ён адмоўны вынік, за справу ўзяліся вышэйшыя пагранічныя чыны, якія растлумачылі, што ад вышкі не будзе ніякай шкоднай радыяцыі, а самую вышку, нягледзячы на тое, што ўжо стартавалі іх будаўнічыя працэдуры, перанеслі на іншы ўчастак. І тыя чыны пераканалі мясцовае насельніцтва, што закон забараняе карыстацца вышкамі для іншых, чым нагляд за граніцай, мэтаў.

— Абразы з камер, устаноўленых на вышках, рэгіструюцца ў цэнтры пагранагляду дзеля зберажэння інфармацыі і захавання доказных матэрыялаў, — інфармуе мяне прэс-сакратар Падляшскага аддзела Памежнай стражы Анна Валошын-Врона. — На вышках будуць устаноўлены прылады тэрмічнага і начнога бачання ды лазерныя дальнамеры. Правільнасць іх прымянення можна ў любы момант праверыць. Адным з вядучых прынцыпаў нашай службы з'яўляецца шчыльнае супрацоўніцтва з насельніцтвам памежных мясцовасцей. Калі, напрыклад, зімою снег замяце дарогі, то нашы хлопцы давозяць у вёскі хлеб... Дарэчы, большасць нашага персаналу — мясцовага паходжання.

Памежнікі на ўсходняй мяжы, як кот у бочцы смятаны — еўрагрошай... што завалісь

У Падляшскім ваяводстве па мяжы з Беларуссю стане трынаццаць такіх трыццаціметровых вышак. Дзве з іх, якія раней прымяняліся для іншых мэтаў, будуць скарыстаны намі, — дадае спадарыня Валошын-Врона. — Апрача аптычнага нагляду ўздоўж граніцы будзе ўстаноўлена сістэма параметрычнага назірання на аснове ўзбуджэння магнетычных дэтэктараў.

У эпоху сацыялістычнага будаўніцтва за шчыльнасць нашай мяжы клапаціўся толькі савецкі бок; у Беларусі „Сістэма" дзейнічае і цяпер. Новыя партнёры ўсклалі і на Польшчу абавязак узяць ахову граніцы ў свае рукі.

Памежная зона ахоплівае тэрыторыі ўсіх прылягаючых да граніцы гмін ды тых гмін, якіх межы набліжаюцца да дзяржаўнай граніцы на адлегласць меншую чым пятнаццаць кіламетраў. У гэтай зоне Памежная страж мае ўсе паліцыйныя правамоцтвы. Насельніцтва адчувае сябе бяспечней, бо і кантакты з пагранічнікамі даволі шчыльныя.

— Заходзяць часта ў хаты, пагутарыць, — кажа жыхарка Свіслачан. — І я іх распытваю, адкуль яны родам. У большасці гэта хлопцы мясцовыя, з Гарадка. Адзін — недзе ад Белай-Падляшскай.

„Нязмерны вольныя прасторы Святой зямлі, — а чалавек мяжы, ірвы, тыны рабіў за векам век, хаваўся ў іх, як ліс у норы..." пісаў 91 год таму Максім Багдановіч. Дваццаць гадоў таму, 14 чэрвеня 1985 года, у Шэнген краіны пасечанага межамі Бенілюкса дамовіліся з суседнімі Францыяй і ФРГ зняць са сваіх грамадзян нявыгады ад перасячэння дзяржаўных граніц, падпісаўшы пагадненне, якое пасля стала адной з асноў шчыльнейшай інтэграцыі еўрапейскіх дзяржаў. Да Шэнгенскага пагаднення далучылася не толькі большасць еўрасаюзных краін, але і, напрыклад, вонкавая Нарвегія. У Шэнгенскую зону стараецца трапіць і Польшча, аднак дзеля гэтага трэба задаволіць строгія патрабаванні. Бо так як выбіваюць клін клінам, так і для адкрыцця адных межаў трэба шчыльней загарадзіць іншыя кардоны.

Вось і дзеля нагляду за гэтай еўрапейскай стэрыльнасцю і ўстануць сучасныя электронныя Светавіды, як колішнія заходнеславянскія багі, заступнікі ваеннай справы і ўрадлівасці. Менавіта тая ўрадлівасць, той еўрапейскі дабрабыт, прыцягвае ў Заходнюю Еўропу хвалі нелегальных імігрантаў і запар з імі тэрарызм, наркабізнес, гандаль людзьмі і іншыя адмоўныя з'явы. Шэнгенскае пагадненне ахоплівае не толькі нагляд за тапаграфіяй еўрасаюзных граніц, але і ўлік усяго руху на гэтых граніцах: не толькі асоб падазраваемых у злачыннай дзейнасці, але і крадзеных аўтамабіляў, узбраення, валюты, асабістых дакументаў і службовых бланкаў. Дзеля гэтага ўліку дзейнічае інфарматычная сістэма SIS (Schengen Information System) з цэнтральным камп'ютэрам у Страсбургу, да якой павінен быць далучаны краёвы кампанент сістэмы. Да SIS Польшча павінна далучыцца ў 2007 годзе...

Аляксандр Вярбіцкі

„Простыя" людзі ☞ 2

Віктар Сазонаў

„Простыя" сяляне, якія здаецца ўжо прывыклі да ўсяго, нічаму не здзіўляюцца і ўсё ўспрымаюць моўчкі, нарэшце пабачылі ў лясах і вадаёмах ахоўнікаў прыродных багаццяў з аўтаматамі. У каго тыя збіраюцца страляць чэргамі..?

Жыць на мяжы ☞ 2

Яўген Вапа

Жыццё на мяжы давяло да гаспадарча-грамадскай дэградацыі той тэрыторыі і знікання беларускага этнасу. Апошніх шэсцьдзесят гадоў, з нашага пункту гледжання, гэта проста адмоўнае ўздзеянне спачатку польска-савецкай, а зараз еўрасаюзна-беларускай мяжы на беларускі лёс...

Талерантнасць? ☞ 2

Мацей Халадоўскі

Прадузятасці ў адносінах да „іншых" усё часцей праяўляюцца і ў такіх словах, як „Ten pedryl", „Ten Żyd", „Ten Ruski", „Ten komuch" і г.д. На шчасце, не даходзіць да масавых акцый баявых дружын супраць „іншых"...

Праз чатыры мяжы ☞ 5

Уладзімір Хільмановіч

Найбольш экстрэмальным выдалася перасячэнне польска-расійскай мяжы ў Голдапе. Паміж Польшчай і Калінінградскай вобласцю ёсць дамоўленасць пра дармовыя турыстычныя візы для грамадзян. На справе ўсё выглядае куды складаней...

Гадавіна садка ☞ 9

Барбара Пякарская: Калі чую галасы бацькоў, што нібыта замнога там беларускасці, тады я гэтага зусім не разумею! Сапраўды, ёсць такі вялікі выбар прадшколляў дзе няма беларускай мовы. А на тое, каб дзіця навучылася дзвюх-трох песень, няма патрэбы хадзіць у садок, кожны можа навучыць гэтага ў хаце...

Раздзяліла граніца ☞ 11

Аляксей Мароз

У шасцідзесятых гадах здарылася такое, што два дні савецкія пагранічнікі прапускалі праз мяжу ў Польшчу, без запрашэнняў, жыхароў вёсак распаложаных побач пушчы ў Беларусі.

— Проста калгаснікі ў час сенакосаў падпаілі савецкіх пагранічнікаў і яны пусцілі іх да нас. Два дні нашы сваякі гасцявалі ў Мацкевічах...

9 770546 196000

„Простыя” людзі

Супрацьстаянне апазіцыі і ўлады на Беларусі многія, апошнім часам, лічылі справай улады і апазіцыі. Простыя людзі не спяшаліся актыўна кагосьці падтрымліваць. А без іх ні тыя, ні другія стабільнага, доўгатэрміновага і яшчэ ў дадатак справядліва здабытага поспеху дасягнуць не могуць. Прычыны пасіўнасці розныя. Хтосьці баяўся за сваю пасаду, працу, маёмасць. Хтосьці за свой лёс. Некаторыя проста баяліся. Іншыя з лянноты не цікавіліся сітуацыяй у краіне, не збіраліся губляць на гэта час. Былі і такія, хто лічыў, што ніякая ўлада імі апекавацца не будзе, ніякія змены іх жыццё не палепшаць, а пражыць ціхенька можна ў кожнах варунках. Такіх прычын безліч. А галоўная, што ўсе людзі на Беларусі лічаць сябе людзьмі простымі. І мяркуюць, што ад іх нічога не залежыць. Таму большасць прагматычна меркавала здабываць дабрабыт для сябе і сваёй сям'і ў тых умовах, якія ёсць, і не сунуць нос у „чужыя” справы. У беларускім грамадстве і прадстаўнікі ўлады, і рабочы клас, і сялянства, і інтэлігенцыя, і прадстаўнікі дробнага ды сярэдняга бізнесу, і тыя хто не належыць ні да якіх класаў спадзяваліся, што сітуацыя ўсталюецца сама па сабе. Ці што хтосьці іншы ўсё зробіць за іх. Галоўнае, каб праблемы і клопаты менавіта іх мінулі бокам. І што нехта там недзе ведае што рабіць. А „простыя” людзі не лезуць не ў сваё. Жывуць ціха. Абы вайны не было. А тое, што добрымі намерамі шлях да пекла ўкладзены, пра гэта можна на нейкі час і забыцца.

Перамогі дэмакратаў у паслясавецкіх краінах, у першую чаргу на Украіне, дадалі надзеі і ўпэўненасці апазіцыі, і напалохалі ўладу. Зацікавілася гэтай сітуацыяй і нацыя „простых” людзей.

Першымі напалохаліся „простыя” людзі ва ўладзе. Ды і жыццё іх кардынальна пачало змяняцца. Яшчэ нядаўна, толькі апазіцыянеры папярэджвалі, што за пэўныя парушэнні правоў чалавека, яны згубяць мажлівасць выязджаць за мяжу. Еўропа адмовіць у візах. Сёння, прэзідэнт Беларусі падпісаў указ, пасля якога наўрад ці хто з іх рызыкне выязджаць у іншыя краіны, без загаду ўсё таго ж прэзідэнта. Ды і ўладныя крэслы сталі не такімі ўтульнымі. За кожную дробную памылку іх можна згубіць. І не толькі крэслы.

„Простых” студэнтаў таксама не абдзялілі ўвагай прэзідэнцкія ўказы. З выездам на вучобу за мяжу ўзніклі непераадольныя праблемы. Або ты набываеш вышэйшую адукацыю ў сябе, або губляеш такое права, калі хочаш яе падмацаваць здабыткамі еўрапейскай навукі. Ну, а калі „пашанцавала” патрапіць на мітынг апазіцыі, то прыйдзецца перайсці з катэгорыі „простых” студэнтаў, у катэгорыю іншых „простых” людзей.

„Простыя” працоўныя на сабе адчулі справядлівасць выслоў'я, што калі ты не цікавішся палітыкай, то палітыка абавязкова зацікавіцца табой. Для іх уводзяцца „палітзаняткі”. Мінімум раз на месяц „простыя” кіраўнікі будуць тлумачыць сітуацыю пра жыццё ў краіне. І хоць нядаўна ўведзеная кантрактная сістэма прыёму на працу не прадугледжвае абавязковага выслухоўвання чужога меркавання, але прадугледжвае аднабаковы разрыў кантракту працадаўцам па любой прычыне.

І „простым” міліцыянерам не салодка. Ім прыходзіцца затрымліваць апазіцыянераў за тое, што палітычныя партыі і іншыя плыні дэмакратычнага накірунку выконваюць сваё прамое прызначэнне, а таксама патрабаванні зарэгістраваных гэтай жа ўладай статутаў, і законна рыхтуюцца да маючых адбыцца выбараў. І яшчэ ў дадатак, гэтым „простым” міліцыянерам увесь час трэба думаць, як тыя апазіцыянеры будуць рэагаваць на іх дзеянні, калі раптам здабудуць уладу. І пра тое, як дзейнічаць, калі ўлада дасць загад рабіць тое, што некалі вучылі не рабіць бацькі.

„Простыя” сяляне, якія здаецца ўжо прывыклі да ўсяго, нічаму не здзіўляюцца і ўсё ўспрымаюць моўчкі, нарэшце пабачылі ў лясах і вадаёмах ахоўнікаў прыродных багаццяў з аўтаматамі. У каго тыя збіраюцца страляць чэргамі? А як жа натуральная цяга да прыроды і немажлівасць без яе рэсурсаў утрымліваць хатнюю гаспадарку (галоўны сродак існавання)?

І „простыя” настаўнікі, і „простыя” бізнесоўцы, і „простыя” навукоўцы, і іншыя „простыя” людзі зразумелі, што вельмі няпроста жыць „простаму” чалавеку. І вельмі цяжка быць „простым” чалавекам. А ў гэты час самай „простай” на свеце ўладзе пачынае ўдавацца тое, чаго доўгія гады дамагалася апазіцыя — абуджаць людзей сваімі дзеяннямі. І людзі паволі абуджаюцца. І усё будзе залежыць ад іх, „простых” людзей. Бо зараз яны змушаныя рабіць свой выбар.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Жыць на мяжы

Так склалася, што ў гэтым нумары „Нівы” тры матэрыялы прысвячаюцца справам міждзяржаўных межаў, а асабліва яе польска-беларускаму вымярэнню. Справа невыпадковая, паколькі жыццё ў памежнай зоне пакідае трывалы адбітак на мясцовым насельніцтве. З аднаго боку, жыццё на памежжы часам можа нат спрыяць пэўнаму эканамічнаму росту. Зразумела, пры ўмове, калі межы звычайна адкрытыя, а іх перасяканне проста незаўважнае. Нам, беларусам у Польшчы, не пашчасціла на такую мадэль. Жыццё на мяжы давяло да гаспадарча-грамадскай дэградацыі той тэрыторыі і знікання беларускага этнасу. Апошніх шэсцьдзесят гадоў, з нашага пункту гледжання, гэта проста адмоўнае ўздзеянне спачатку польска-савецкай, а зараз еўрасаюзна-беларускай мяжы на беларускі лёс ад Аўгустоўскага канала на поўначы, аж па Мельнік на поўдні ваяводства. Спачатку замацавалася тут „самая лепшая савецкая памежная сістэма”, якая мела ахоўваць краіну камуністычнай шчаслівасці ад варожага захаду і няпэўных саюзнікаў, а пры нагодзе звесці да нуля міжчалавечыя, сямейныя сувязі падзеленай на „польскі і рускі” бок Брэстчыны і Гродзеншчыны. А размовы пра адметную беларускасць у памежнай зоне трэба было спыніць як найхутчэй. Аляксей Мароз у гэтым жа нумары „Нівы” ў размове з Васілём Хмарам з маіх родных Мацкевічоў (Доўгага-Броду) паясняе, якім асабістым сумным досведам для пакалення маіх бацькоў і дзядоў аказалася новая рэчаіснасць. Нам, іхнім дзецям, ніхто не хацеў сказаць, што зараз за мяжой жывуць такія ж самыя беларусы, часта сваякі. У пачатковай школе жыхар суседніх Каменюкоў быў для мяне такім жа самым далёкім савецкім чалавекам як жыхар Мурманска. Савецкая прастора — быццам у песні „Мой адрас — Савецкі Саюз”. Але з успамінаў майго суседа Васіля Хмары, жонка якога Ніна гэта ж мая хросная маці, вынікае для нас адна непраўдападобна-фантастычная гісторыя. Пакуль разваліўся берлінскі мур і ў Віскулях на беларускім пушчанскім баку быў распушчаны Савецкі Саюз, то ўжо ў шасцідзесятых гадах партызанскім спосабам, пры дапамозе некалькіх літраў гарэлкі, сваякі і сябры міжваеннага пакалення бацькоў і дзядоў з суседніх памежных вёсак упершыню „зламалі сістэму” паміж Старыной і Войнаўкай. Думаю, што нашы гісторыкі павінны неадкладна гэтую справу высветліць, пакуль жывуць яшчэ сведкі гэтых падзей, бо, гаворачы сённяшняй мовай палітыкі, гэта было першае ўз'яднанне падзеленай Еўропы. Без пашпартоў, з энтузіязмам і радасцю сустрэліся пасля дваццаці гадоў разлукі найбліжэйшыя сабе людзі. От, як раней, звычайна, прыйшоў на лавачку на „вэчуркі” сусед з другой вёскі. Пагаварылі пра коней, кароў, убранае сена, перакінуліся абавязкова некалькімі словамі пра палітыку, крыху памаўчалі і разышліся. Да наступнай сустрэчы. У гэтыя дні ў навакольных крамах разышліся ўсе запасы гарэлкі. Марыцца яшчэ мне беларускі Кустурыца, які на аснове гэтых здарэнняў зняў бы фільм, які, гарантую, зрабіў бы фурор ва ўсім свеце. Беларускія сяляне асмешылі савецкую сістэму. І то як! Нічога дзіўнага, што потым СССР рассыпаўся друзам.

Але мяжа не можа пуставаць. Калі раней славутая сістэма мела ратаваць усход ад наступу захаду, то зараз еўрасаюзная мяжа ахоўваць мае захад, але ад усходу. І як заўсёды, найбольш ад гэтага церпяць людзі, якім менавіта выпала жыць тут, а не ў іншым месцы. Сотні мільёнаў еўра выдаткоўваюцца на ахову польска-беларускай мяжы, на назіральныя вышкі, пра якія піша Аляксандр Вярбіцкі, і з якіх адсочаць усіх і ўсё гэтыя вочы і вушы Еўропы. Але ніхто не хоча даць такіх грошай насельніцтву Усходняй сцяны. Апошнія падзеі ў Бруселі паказалі, што не будзе дадатковых сродкаў для адсталых рэгіёнаў, у тым ліку і для Падляшша. Адзінае, што інстынктыўна робяць пасвараныя еўрапейскія палітыкі і бюракраты — гэта ўмеласць ахоўваць сябе і сваю бяспеку. Таму грошай на мяжу хопіць. Толькі цікава за кім яны будуць наглядаць за некалькі гадоў на нашым баку, калі пры такой палітыцы нашы памежныя вёскі амаль поўнасцю пройдуць спачываць на могільнікі. Тады, хіба, можна будзе таксама і памежным войскам спакойна займацца аховай гінуўшых гатункаў звяроў і птушак. Тады знойдуцца грошы на ўсё.

Яўген Вапа

Вачыма еўрапейца

Польская талерантнасць — чысты міф

Палякі з вялікай ахвотай гавораць аб уласнай талерантнасці. Толькі час ад часу аказваецца, што штосьці з ёю не так. Паказаў гэта ў апошні час варшаўскі „Парад роўнасці”. Контрманіфестацыі са спробай канфрантацыі сарганізавала крайне правая Усяпольская моладзь з падтрымкай м.інш. Лігі польскіх сем'яў (LPR). Праўда, погляды гэтай моладзевай групоўкі — непрадстаўнічыя для ўсяго грамадства, аднак пашчыльненне радоў і адчай, з якім тыя погляды маніфестуюцца, робяць уражанне, быццам у іх руках атрыманы ад грамадства ўсёграмадскі мандат.

Хваляванне і абурэнне асяроддзяў, якім блізка да Усяпольскай моладзі, выклікаў таксама ў апошнія дні рапарт Савета Еўропы. У ім сцвярджаецца, што ў Польшчы ўсё жывая праблема антысемітызму. І хоць упаўнаважаны па грамадзянскіх правах Анджэй Цоль і польскія яўрэі пераконвалі пасля абнародавання рапарта, што гэта несправядлівая ацэнка, то гледзячы на г.зв. штодзённае жыццё, цяжка з ім не пагадзіцца. Усё ў спрэчках можна пачуць у абразлівай форме: „Ty Żydzie!”. Што і руш на мурах паяўляюцца лозунгі „Żydzi won!”, хоць можна ўбачыць іх часта ў гарадах і мястэчках, у якіх яўрэяў няма ад шасцідзесяці гадоў, а маладое і сярэдняе пакаленне з прадстаўнікамі гэтай нацыянальнасці ніколі не сустрэлася. Дарэчы, прадузятасці ў адносінах да „іншых” усё часцей праяўляюцца і ў такіх словах, як „Ten pedryl”, „Ten Żyd”, „Ten Ruski”, „Ten komuch” і г.д. На шчасце, не даходзіць да масавых акцый баявых дружын супраць „іншых”. У сучасным свеце (справа не ў геаграфічных падзелах) была б гэта, аднак, занадта яркая праява дыскрымінацыі, якая магла б сустрэца з масавым супрацівам, аб чым ведаюць раскідаючыся ўспомненымі лозунгамі. Часта затое можна з іх боку пачуць сцвярджэнне: „Няхай яны і жывуць сабе далей, але далёка ад нас”. Тое „далёка” азначае бытаванне па-за абочынамі грамадскага жыцця, без роўных правоў.

Калі раздумваў я над тым, адкуль бярэцца той недахоп талерантнасці, дыскрымінавання, пераканала мяне адна прафесарка сацыялогіі. Мяркуе яна, што спасылка на талерантную Польшчу, на традыцыі талерантнай Польшчы — чысты міф. Фактычна, гэтак было ў Рэчы Паспалітай да падзелаў. Пасля за 200 гадоў, з кароткім перапынкам у міжваенны перыяд і то галоўным чынам на арганізаванне дзяржаўнасці, палякі мелі заўжды „ворагаў” — расіян, аўстрыйцаў, пройсаў, гітлераўцаў, саветаў і г.д. Выклікала гэта пачуццё неабходнасці абароны ўласнай тоеснасці, якое пераходзіла ў акопванне сябе ў фетышах польскасці. Вынікі тых 200 гадоў адчуваюцца больш дакучліва, чым у якой-небудзь еўрапейскай дзяржаве, таксама дасведчанай гісторыяй, ды ў адносінах да гісторыі Польшчы на значна меншым ці іншым меншым узроўні. Пара, аднак, з гэтым неяк справіцца.

Мацей Халадоўскі

Вера, Надзея і... Бельск

— Ужо пасля дванаццаці, а Надзі яшчэ няма ў рэдакцыі, — з нецярплівасцю спаглядала ў акно і на гадзіннік Галіна Рамашка, без якой цяжка ўявіць штодзённае і святочнае існаванне „Нівы". Яе ўсхваляванне было поўнасцю апраўданае. На пятніцу, 10 мая, на першую гадзіну пасля абеду Надзея Артымовіч назначыла тэрмін святкавання 35-годдзя яе літаратурнага дэбюту, зразумела, на старонках нашага тыднёвіка, пра што зусім нядаўна пісала Міра Лукша. Згодна жаданню юбіляркі сустрэча павінна была мець рэдакцыйна-сяброўскі характар, але прытым нічога не магло быць банальнага і афіцыйнага. Сказана — зроблена. Для самай таемнай дамы беларускай літаратуры не адмаўляецца. Праплыла над беластоцкім небам аднакрылая птушка...

Фота рэдакцыі

На першым плане злева: Ганна Кандрацюк, Ежы Плютовіч, Надзея Артымовіч і Юры Туронак

Падрыхтоўка

Ганна Кандрацюк адважна ўзяла на сябе ролю пазітыўнага медыума, які меў запрошаным і прысутным даць камфорт узнёслай духоўнасці спалучанай са звычайнай чалавечай добразычлівасцю. І найважнейшае, усклала на сябе абавязак непасрэднага кантактавання з паэтэсай. Кожны, хто хаця раз у сваім жыцці ўзгадняў арганізацыйныя справы з паэтычнай ці мастацкай часткай любога грамадства, хіба ведае, што гэта абазначае. Чытанне ў думках аўтараў — гэта самае мінімальнае патрабаванне. На маю долю выпаў прыемны абавязак узбагаціць чароўны свет паэзіі прыемным букетам смаку і паху дзвюх бутэлек імпартнага віна. Спадарыні Галіна Рамашка і Геня Палоцкая ў незаўважальны спосаб вырашылі ўсе іншыя арганізацыйныя пытанні; прыгожыя кветкі загадзя красаваліся ў рэдакцыі. Заставалася толькі чакаць паэтэсу і запрошаных сяброў. Усіх у напрузе трымала яшчэ адна маючая адбыцца нечаканасць. Як паведамілі сябруючыя з намі „птушачкі", у час сустрэчы, пасля доўгага маўчання, Надзея Артымовіч мела ўсіх зачараваць сваімі новымі вершамі. І то ў рэдакцыі „Нівы"! Мы хацелі яе неспакою. Дачакаліся...

Чаканне з кветкамі

— Ці не з'явілася я зарана? — прыцішаным, сціплым голасам, без дваццаці першая, адазвалася паэтэса, пераступаючы парог рэдакцыі. Як пазней выявілася, паспела яна ўжо ў Беластоку наведаць усе кнігарні і песціць сваімі вачыма і рукамі запісаныя словы. Прастору паперы і космас мовы. У яе твары і голасе наглядалася і адчувалася хваляванне. Вера. Надзея. — Паглядзіце, я сёння апранута не толькі ў чорныя колеры, — заявіла ўсцешаная, пабачыўшы, што мы сапраўды яе чакалі. Чорны колер і цыгарэта — неад'емная частка пластычнага вобразу і сяброўскіх здымкаў Надзеі Артымовіч. Асабліва пасля вяртання ў Бельск у канцы сямідзесятых мінулага стагоддзя. Прыпісаная, наканаваная тоеснасць другімі (так павінен выглядаць паэт), ці жалоба па яе родным Бельску, якога ўжо няма, а які так метафізічна для вечнасці запісала ў сваіх вершах паэтэса? Бяльскова-беластоцкая бяздушнасць — гэта адзіная адплата паэтэсе сусветнага вымярэння. Паэтычнасць не ёсць медыяльнай. Усім палітыкам, самаўрадаўцам, людзям псеўдакультуры размова пра злабадзённыя клопаты Надзеі з'яўляецца толькі імгненнем і нагрузкай у параўнанні з нейкай неакрэсленасцю важных спраў. Свет паэзіі беларускіх іконаў і яе аўтаркі найлепей прызабыць. Прыхаваць. Не памятаць. Застаюцца толькі блуканні па бельскіх могільніках.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

* * *

Над Бельскам шэрае неба
шэры брук шэры парог забыты музык
на шэрым парозе

Бельск
мястэчка памежжа мястэчка бязмежжа

на шэрым парозе
стары музык
заснуў

На шчасце не ўсе забыліся. Калі забубнілі першыя кроплі дожджыку, з ружамі з'явіўся сябра Надзеі і не менш знакаміты польскамоўны паэт таксама з бельскімі каранямі Юрка Плютовіч. Каралеўская літаратурная пара Беласточчыны — так назваў я іх у час іхняга супольнага выступлення на мінулагоднім літаратурным семінары „Бязмежжа". Моцна хацелася б, каб людзі пабачылі і пачулі іх паэзію разам урэшце ў культурных і асветных установах у родным горадзе Бельску, Беластоку, Гайнаўцы. Але таксама ўва ўсёй Польшчы і Еўропе. Паэзію не прысудзіць на папялішча. Людзей, на жаль, можна.

З касмічнай хуткасцю і дзесяткам праблем для неадкладнага іх афармлення пры нагодзе сустрэчы, пасля доўгага небыцця ў рэдакцыйных пакойчыках, узляцеў да нас вечна малады хлопец з Цісоўкі — Багдан Дудко. На штодзень не абы-хто — галоўны пан рэдактар польскага літаратурна-мастацкага часопіса „Карткі". На добры дзень прызнаўся ў сваёй пашане да беларускай літаратуры і паэзіі Артымовіч. З уласцівым сабе тэмпераментам даў перакладчыцкую прапанову для яе вершаў у сваіх выданнях, чым у чарговы раз выклікаў у гераіні сустрэчы бязмежны шацунак і павагу для сваёй асобы. (Як не парадаксальна, але пакуль улады далі магчымасць з'явіцца на свет у 1981 г. першаму паэтычнаму зборніку Надзеі Артымовіч „Роздумы", то тры гады раней Ян Леанчук у перакладзе на польскую мову падрыхтаваў падборку вершаў пад загалоўкам „Свет маляваны смуткам"). Багдан Дудко хутка запрапанаваў „Ніве" медыяльны патранат над арганізаваным ім неўзабаве бенефісам Сакрата Яновіча. Пры нагодзе тэлефоннымі званкамі вырашыў некалькі друкарскіх пытанняў. Добрая энергетыка сустрэчы, закладзеная спецыяльна Ганнай Кандрацюк, спрацоўвала! Пацвердзіліся і словы Аліка Максімюка, таксама рэдакцыйнага любіцеля паэзіі, які сказаў: „Рэдакцыя «Нівы» як царква — дзверы адкрытыя для ўсіх". І людзі, і кветкі плылі прыцішана на сустрэчу. Аліна і Мікола Ваўранюкі з падораным Надзеі букетам гваздзікаў вярнулі паэтэсу ў час яе паэтычнага пакалення маладых гнеўных. Каб не загінуў сон. І ноч не перастала быць ноччу.

Мела шчасце да гісторыкаў

Позіркі і думкі Надзеі Артымовіч накіроўваліся тым часам у чаканне прыезду чалавека, які адыграў гістарычную ролю ў адкрыцці яе таленту для беларускай і сусветнай літаратуры. Выходзім перад будынак рэдакцыі. Надзея ўспамінае сваю першую аўтарскую вечарыну, якая адбылася 8 снежня 1976 года ў варшаўскім клубе БГКТ, што знаходзіўся па вул. Сенатарскай, 8. Як сёння памятае тую музыку Шапэна, якая спадарожнічала чытаным ёю вершам. І памятае гэтую веру і надзею ў добрых людзей, якія яе не пакрыўдзілі, не падвялі. Урэшце здалёк заўважаем доўгачаканую асобу.

— Мела я шчасце да гісторыкаў, — вымавіла з сябе, калі да нас наблізіўся, як заўсёды элегантны, гэтым разам з чырвонымі пунсовымі ружамі, Юры Туронак. Так. Гэта Юры Туронак — эканаміст, гісторык — аказаўся яе добрым анёлам-ахоўнікам. Як сам прызнаўся, у палове сямідзесятых гадоў на сваёй пішучай машынцы аддрукаваў некалькі вершаў і пераплёў іх. Аказваецца, быў гэта першы зборнік Надзеі Артымовіч у пяці экземплярах, якія з сённяшняга пункту гледжання смела можна назваць падпольнымі. Цаны на іх няма. Як чалавек сарганізаваны, спадар Туронак вёў дакладныя запісы калі і дзе друкаваліся вершы паэткі. У такой сітуацыі не было ўжо іншага выхаду як застацца складальнікам і рэдактарам першага вышэйзгаданага зборніка Артымовіч „Роздумы". У час сустрэчы выявіў ён яшчэ адну важную прычыну свайго рэдактарскага задавальнення.

— Я ж не пісьменнік, літаратар, а ўступ да кніжкі сам напісаў. Ніхто не дапамагаў, — усміхаючыся ў гэты момант, успамінаў. Дарэчы, рэдактарам паэтычнага зборніка Надзеі Артымовіч „Адплывае спакойнае неба", выдадзенага ў 1999 годзе быў не хто іншы, а толькі прафесар гісторыі Яўген Мірановіч. Палічыць календары. Не знішчыць кветкі...

А потым былі пераклады і новыя вершы. Словы прымірэння і гневу. Вершы выспелыя ў час болю і непраспанага. Вера і надзея патрачаныя ў эмацыянальным самазнішчэнні ў родным горадзе. Ужо толькі горадзе... Доўгая дарога дадому. У Бельск.

Яўген Вапа

У Чаромсе

Гмінная камунальная гаспадарка ў Чаромсе займаецца кватэрнымі справамі, добраўпарадкаваннем і ачышчаннем вуліц у пасёлку, рамонтам гмінных дарог, селектыўнай зборкай і рэцыклінгам адходаў. У гэтай установе працуе васемнаццаць чалавек. Дырэктарам з'яўляецца Анджэй Янушчык. На тэрыторыі гміны знаходзіцца 18 кантэйнераў для селектыўнай зборкі макулатуры, пластмасавай і фольгавай упакоўкі ды шкла, чатыры рэзервуары камунальныя — два гады таму гміна яшчэ прыкупіла пяць. Фірма карыстаецца адмысловым аўтамабілем для вывазкі і апарожнівання кантэйнераў. За тры гады (2002-2004) фірма прадала 73 147 кг адходаў, у тым ліку 38 620 кг макулатуры, 6 735 кг фольгавай і пластмасавай упакоўкі, 2 800 кг стальнога лому, 1 362 кг алюміневага лому, 7 100 кг — разбітага каляровага шкла і 16 530 кг разбітага белага шкла. Чаромхаўская камунальная гаспадарка заключыла дагавор на скупку з беластоцкай фірмай „Intercell Recycling". Апрача таго фірма займаецца добраўпарадкаваннем гміннай, як і вясковых сметніц, а таксама ачышчальняў сцёкаў. Хачу прыкмеціць, што вынік селектыўнай зборкі адходаў быў бы намнога лепшы, каб грамадзяне выкідалі непрыгодныя рэчы ў размешчаныя кантэйнеры, а не ў прыдарожныя равы і лес. А такія рэчы, на жаль, у чаромхаўскім асяроддзі здараюцца.

Уладзімір Сідарук

У Старым Ляўкове

Побач прыгожага будынка былой Пачатковай школы ў Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) знаходзіцца перадваенны дашок над брамай. Жыхары Старога Ляўкова і навакольных вёсак зжыліся з ім. Усе, хто едзе стараляўкоўскай вуліцай, гляне на яго. Вёска вылучаецца ім сярод іншых сёл.

Драўляная гонтавая стрэшка патрабуе рамонту — неабходны новыя гонціны. На вясковым сходзе з удзелам войта Нараўчанскай гміны жыхары Старога Ляўкова вырашылі, што дашок трэба адрамантаваць.

З прапановай аднаўлення дашка ля школы некалькі разоў на працягу двух гадоў выступаў на сесіях Гміннай рады ў Нараўцы Янка Целушэцкі. Ён пераконваў радных, аргументаваў. Войт абяцаў: „Дашок будзе адрамантаваны". Час няўмольна бяжыць, а рамонту не відаць.

Падчас сесіі Рады гміны 8 чэрвеня г.г. жыхар Ляўкова ізноў спытаў, калі ўжо той рамонт дашка. Войт адказаў, што няма каму гэта зрабіць. Быццам бы няма спецыялістаў. Ды і школу трэба хутка прадаць. А тады няхай зойміцца гэтым набытчык. І яшчэ. Што, моў, толькі Ян Целушэцкі па ім (дашку) сентыментальнічае. А што на гэта жыхары Старога Ляўкова, радныя ды солтыс гэтай прыгожай вёскі над ракою Нараўкай? Ці ўсе мы будзем чакаць, ажно дашок час сатрэ... **(мох)**

У Вітаве было цяжка

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пасля вайны гаспадары мусілі плаціць шмат падаткаў. Жыхары Вітава, у якіх было многа поля, працавалі ў лесе, каб зарабіць дадатковыя сродкі на аплату падаткаў і пазбегнуць турэмнага пакарання...

У Вітаве (гміна Дубічы-Царкоўныя), распаложаным непадалёк Белавежскай пушчы, адразу пасля вайны было неспакойна. Ноччу праз лес дабіраліся ў вёску ўзброеныя зладзеі. Забіралі яны ў гаспадароў харчаванне і вопратку. Каб забяспечыцца ад узброеных бандаў, многія жыхары Вітава ўступілі ў рады ОРМО — Добраахвотнага запасу грамадзянскай міліцыі. Калі гаспадарам стала жыць лягчэй, мясцовыя ўлады стварылі ў Вітаве калгас. Высокія падаткі і невялікі даход з няякасных прыпушчанскіх зямель нават найбольш стойкіх гаспадароў прымушалі пакідаць індывідуальнае гаспадаранне і ўступаць у калектыўную гаспадарку.

Грабілі ноччу

— Узброеныя зладзеі, што прыходзілі ў нашу вёску ноччу, забіралі ад гаспадароў харчы. Гаварылі яны на чыстай польскай мове і былі з больш аддаленых ад нас вёсак. Аднак маглі паказваць ім дарогу нейкія мясцовыя людзі. Найчасцей прыходзілі за харчамі перад святамі, калі гаспадары калолі вепрукоў. Калі мы закалолі свінчо, зладзеі наведалі і наш панадворак. Доўга стукалі ў акно, але мы баяліся і не ўпускалі іх у хату. Калі пачалі страшыць нас вінтоўкай, то мы адкрылі ім дзверы. Зладзеі думалі, што мы схавалі перад імі зброю і былі вельмі ўсхваляваныя. Забралі ў нас свежае мяса, іншыя прадукты ды новыя скураныя боты. Нават знайшлі схаваную над хатай у палове самагонку. Забраныя ў нас харчы павезлі на возе, — кажа Фёдар Аўсянюк, які жыве пры канцы вёскі.

У першыя гады пасля вайны ў Вітава прыязджалі агітатары і нагаворвалі выязджаць у Савецкі Саюз. Некаторыя гаспадары паверылі, што ў Расіі добра жывецца. Чатыры сямействы рашыліся пакінуць родную вёску і выехалі жыць за ўсходнюю мяжу.

— Спачатку паміж Савецкім Саюзам і Польшчай быў жалезны занавес і ніякай інфармацыі ад нашых вяскоўцаў, што выехалі на ўсход, мы не атрымлівалі. Толькі пасля мы даведаліся аб іх лёсе ў Савецкім Саюзе, — гаворыць спадар Фёдар.

Цяжка было гаспадарыць

— Мой дзед найбольш лугоў ачысціў з дрэў і кустоў і таму ў нас было многа поля. Аднак пасля вайны з-за вялікіх падаткаў прыбытку ад гэтага поля не было. Дадаткова плацілі мы ўзносы на адбудову Варшавы і будову школ. Была ў нас зямля шостага класа. Толькі ў некаторых месцах было поле пятага класа, — тлумачыць спадар Аўсянюк. — Паколькі было ў мяне многа зямлі, касіў я збожжа касой. Гаспадары, у якіх было менш поля, збожжа жалі сярпамі.

— У нас быў вельмі слабы плён, а трэба было аддаць за сімвалічныя грошы кожны год, у якасці абавязковых нарыхтовак, 7 цэнтнераў жыта, паўтары тоны бульбы і 350 кг мяса, — кажа сын Фёдара Аўсянюка, Анатоль.

Пасля вайны каля Вітава было многа балотаў, а на частцы лугоў доўга не ўступала ў зямлю вада.

— Калі мы касілі траву, то трэба было яе выносіць на сухое месца, каб высушыць на сена. Людзі мучыліся, гадавалі мала кароў і таму мелі мала гною на паляпшэнне плёнаў на палях. Калі пасееш збожжа на нашых пясчаных землях без гною, то яно вельмі слаба расце. Каб палепшыць плён, сеялі мы на палях лубін, а пасля прыворвалі яго, — расказвае Фёдар Аўсянюк. — Найчасцей сеялі мы жыта, авёс і садзілі бульбу. Яшчэ да ўзнікнення калгаса зрабілі ў нас меліярацыю.

Пасля вайны некаторыя жыхары Вітава запісаліся ў Польскую рабочую партыю. Многа асоб стала дружыннікамі ОРМО.

— У Польскую рабочую партыю часцей запісваліся бяднейшыя гаспадары. Кулакоў у партыю не бралі, бо лічылі шкоднікамі народа, — паясняе мой суразмоўца.

Коратка дзейнічаў калгас

Калгас у Вітаве ўзнік пасля агітатарскай работы прыезджых людзей.

— Прыязджалі чыноўнікі і агітавалі ўступаць у калгас. Гаварылі, што хочуць ліквідаваць загоны, — тлумачыць Фёдар Аўсянюк.

На калектыўнае гаспадаранне рашаліся спачатку сем'і, у якіх было менш зямлі. Ім цяжка было пражыць ад прыбытку з сельскай гаспадаркі. Фёдар Аўсянюк, у якога было найбольш зямлі ў вёсцы, рашыўся не ісці ў калгас, толькі гаспадарыць індывідуальна.

— Некаторыя гаспадары адразу запісаліся да калектыўнага гаспадарання. Маю зямлю забралі ў калгас, а далі дрэннае поле. Паколькі было ў мяне многа поля, бо ажно 28 гектараў, аблажылі нас вельмі вялікімі падаткамі. Я яшчэ сам гаспадарыў адзін год. Пасля жыццё прымусіла запісацца ў калгас, — гаворыць спадар Аўсянюк.

Працуючы ў калгасе Фёдар Аўсянюк не мусіў плаціць падаткаў. Лічылі колькі дзён ён з жонкай працавалі ў час палявых работ і восенню за гэтую працу давалі ім з супольных запасаў жыта, авёс і бульбу на харчаванне сям'і і на корм для каня, свіней і курэй.

— Калі я запісаўся ў калгас, то трэба было хадзіць са сваім канём араць і выконваць іншыя працы ў полі. Касілі мы, жалі, гной вазілі, бульбу садзілі. Гадавалі мы кароў, бо было многа супольных вясковых лугоў. Дадаткова прадавалі мы масла і смятану. Аднак усе трымалі коней і кароў дома. Калгас у нашай вёсцы дзейнічаў толькі два гады. Узнік у 1950-х гадах, а раскідаўся пасля прыходу да ўлады Гамулкі. Не было ў нас нават супольнай аборы, — кажа спадар Фёдар.

Пасля развалу калгаса Фёдар Аўсянюк атрымаў усё сваё поле, на якім гаспадарыў у дакалгасны перыяд. Хаця ён сеяў многа збожжа, прыбытак на няякасных землях быў невялікі. Прыбытку ад сельскай гаспадаркі не хапала, каб аплаціць усе падаткі і мусіў працаваць у лесе, каб пракарміць сям'ю.

— Пасля выступлення з калгаса таксама трэба было плаціць вялікія падаткі. Я першым у вёсцы прыдбаў воз з гумовымі коламі і хацелі забраць яго за падатак. Лічылі нас багачамі і патрабавалі найбольш плаціць, — тлумачыць мой суразмоўца.

Аляксей Мароз

Праз чатыры мяжы

Руіны замку Істэнбург

Беларуска-польская мяжа ў Брузгах — гэта асобны свет са сваімі правіламі, парадкамі і „канстытуцыяй", парушаць якія не дазволена, здаецца, нікому. У аналы „сусветнай энцыклапедыі граніцы" гэтая мяжа ўжо трывала ўвайшла як адна з самых атракцыйных і каларытных. Мяжа ў Брузгах — гэта „дарога жыцця" і суцэльная дынаміка.

Нядаўна ў складзе міжнароднай журналісцкай групы давялося мне праехаць праз межы чатырох краін, што складаюць Еўрарэгіён „Нёман". Такі „круіз" (Гродзеншчына — Сувальшчына — Калінінградская вобласць — Літва — Гродзеншчына) і чатырохразовае перасяканне граніц паміж дзяржавамі сталі надзвычай цікавым досведам.

Праграма побыту на Сувальшчыне прадугледжвала наведванне мясцовых прыродных, агратурыстычных і гістарычных мясцін. На радзіме Анджэя Вайды вельмі моцны лакальны патрыятызм, тут не любяць беластачан і ніяк не могуць змірыцца з адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформай, якая ўзбуйніла ваяводствы. Раён Аўгустоўскага канала — тэрыторыя высокага развіцця турызму і агратурызму, гэткі своеасаблівы кландайк. Найбольш развітым асяродкам з'яўляецца пакамедульскі кляштар у Віграх. Часам, аднак, здаецца, што палякі занадта камерцыялізуюць сваё нядаўняе мінулае. Нават тыя мясціны, якія наведваў папа Ян Павел II.

Найбольш экстрэмальным выдалася перасячэнне польска-расійскай мяжы ў Голдапе. Паміж Польшчай і Калінінградскай вобласцю ёсць дамоўленасць пра дармовыя турыстычныя візы для грамадзян. На справе ўсё выглядае куды складаней. Калінінградскія бутлегеры вырабляюць такія візы і едуць у Польшчу па сваіх кантрабандных справах. Цяпер, калі пачалася новая „халодная вайна", усё ўскладнілася. Польскія памежнікі сталі актыўна касаваць візы цыгарэтным „турыстам". У адказ некалькі соцень расійскіх кантрабандыстаў адразу за шлагбаумам заблакіравалі пераезд мяжы для польскіх машын. Цягам цэлага дня пераехаць гэтую барыкаду не ўдалося аніводнаму транспартнаму сродку з польскімі нумарамі. Пасля расіяне казалі, што ініцыятарамі гэтай акцыі сталі армяне, дыяспара якіх у Калінінградскай вобласці ўсё павялічваецца. Наш аўтобус, у якім акрамя палякаў, былі беларусы, літоўцы і расіяне, усё ж прапусцілі, хаця і закідалі яйкамі і каменнямі. У ашчэраным натоўпе ўдалося разгледзець толькі пару асоб „каўказскай нацыянальнасці", астатнія твары былі праўдападобна славянскія.

Калінінградская вобласць уразіла сваёй саветызаванасцю. Завочна гэты энклаў падаваўся мне нейкім заходнім асяродкам у складзе сённяшняй расійскай імперыі. Рэчаіснасць жа іншая. На былых прускіх землях пануе не заходні і не расійскі, а савецкі дух. Прыкладам, наша Гродна зараз моцна расіязаванае, але назваць горад савецкім не павернецца язык. У Чарняхоўску, дзе мы былі, зусім іначай. Стаўленне Масквы да свайго-несвайго рэгіёна можна характарызаваць праз дробны прыклад. Адным з прадметаў гонару жыхароў Істэнбурга (так называўся раней Чарняхоўск) быў конь па мянушцы Тэмпельхютэр. У перакладзе з нямецкай азначае „захавальнік храма", які вар'ят даў яму такую мянушку невядома, але гутарка не пра гэта. Вызначыўся гэты жарабец знакамітай тракененскай пароды тым, што стаў „вытворцам" ажно ста дваццаці сабе падобных нашчадкаў. За што пазней быў уганараваны бронзавым помнікам, які стаяў каля галоўнага будынка мясцовага конезавода. У 1945 годзе бронзавы Тэмпельхютэр быў вывезены ў Маскву, нейкі час ён стаяў ля ўваходу ў адзін з музеяў, потым быў папсаваны вандаламі і зараз збірае пыл недзе ў сховішчах. Мясцовая адміністрацыя Чарняхоўска неаднаразова ставіла пытанне пра вяртанне коннай статуі на ранейшае месца, але нязменна атрымвала адзін адказ: „Заваяваныя трафеі вярнуць немагчыма". Вось гэта і ёсць сутнасць імперскага цэнтра: „Не аддамо нават вашае і непатрэбнае нам!" Зараз за адбудову помніка бяруцца немцы. Архітэктурная спадчына, у прыватнасці, старажытныя прускія замкі, як і ў Беларусі, моцна занядбаная.

Што спадабалася на гэтай зямлі — скрозь дрэвы абапал дарог. Яшчэ нядаўна так было і ў нас, на Гродзеншчыне, але апошнім часам акупацыйная ўлада бязлітасна вынішчае вакол шляхоў усе прысады. Фантастычны конезавод адбудаваны ў Георгіенбургу, яго колькі год выкупіў расейскі нуворыш па прозвішчы Оружаў. Сам ён „зрабіў" капітал на паліве, а цяпер жыве настала ў Аўстрыі, у Георгіенбург наведваючыся час ад часу з мэтай „інспекцыі" звышдагледжаных коней. Агульнае ж адчуванне класічнае — бляск і жабрацтва поруч.

Калінінградска-літоўскую мяжу праехалі найхутчэй, адпаведна не засталося ўражанняў. Літоўцы не паспелі яшчэ так разгарнуцца ў Еўрарэгіёне „Нёман" як палякі і сцягнуць з аб'яднанай Еўропы столькі грошай, але эканамічнае развіццё ідзе шпаркім крокам. Прытым сувязі з бліжэйшым суседам — Беларуссю — мінімальныя. Мяжа паміж нашымі краінамі — сама зачыненая. Як кажа Міхась Андрасюк, праз такія граніцы хутка вароны пачнуць разбівацца. Гэта раней у Друзгенікі, Варэну ці Вільню маглі вольна ехаць штотыдзень кожны беларускія студэнт ці хатняя гаспадыня. А цяпер нават рэйкі разабралі, цягніком наўпрост не заедзеш. А сама галоўнае — дарагія візы. 20 еўра за адзін візіт не кожны можа выкінуць. Вось і пустая мяжа ў Прывалцы, якая калісьці мела Магдэбургскае права. Апошнія месяцы, праўда, сродкі масавай інфармацыі шмат пішуць пра міждзяржаўныя перамовы і змяншэнне коштаў візаў да 5 еўра, але рэальных зменаў пакуль няма. Віна тут, мяркую, не толькі беларускага боку, бо ёсць у нашых суседзяў (не толькі, зрэшты, у літоўцаў) нейкі гістарычны комплекс. Хоць і кажуць усе, што няма нас, беларусаў, але нашай прысутнасці (не саўковай, а менавіта беларускай) баяцца.

Уладзімір Хільмановіч

Экуменічныя крыжы

5 чэрвеня ў Альхоўцы на акраіне Белавежскай пушчы адбылася рэлігійная ўрачыстасць з удзелам праваслаўных і каталікоў.

На канцы вёскі пад лесам мясцовая ўлада паставіла альхоўцам два дубовыя крыжы: праваслаўны і каталіцкі пад адной гарызантальнай перакладзінай. Больш такіх крыжоў нідзе не відна.

Калісьці людзі верылі, што хрысціянскі крыж бароніць мясцовасць ад розных няшчасцяў. У далёкім 1927 годзе жыхары Альхоўкі ў пачатку вёскі паставілі каменны крыж, які стаіць да сёння. Старажылы кажуць, што тады сяляне сабралі шмат грошай, каб заплаціць за работу майстру каменшчыку з Семяноўкі. Была гэта вартасць адной каровы. Цяпер жа, новыя крыжы дасталіся альхоўцам, так сказаць, дармова. Ініцыятарам і праектантам экуменічнага крыжа з'яўляецца пенсіянер Тадэвуш Кшыжаньскі, які пераехаў у Альхоўку з прыгожага Кракава. Вырашыў ён паставіць такі асаблівы крыж насупраць сваёй хаты. Надляснічы даў матэрыял, войт забяспечыў пабудову зямлёй і тратуарнымі пліткамі. Актыўна ўключыліся ў мерапрыемства солтыс і радны Альхоўкі.

5 чэрвеня праваслаўны і каталіцкі святары з Нараўкі сарганізавалі ўрачыстую працэсію і пакрапілі свянцонай вадой новыя крыжы. Потым усе ахвотныя сабраліся ў святліцы, дзе прадаўжалі бяседу з песнямі і танцамі да позняга вечара. Усе захапляліся панарамай старой вёскі, якую на сцяне былой школы цудоўна намаляваў Тадэвуш Кшыжаньскі. Ён па прафесіі мастак. Цікавы факт, што мастак Кшыжаньскі з'яўляецца прапраўнукам Дуніна-Марцінкевіча, класіка беларускай літаратуры. Бацькі Тадэвуша пасля вайны, у час рэпатрыяцыі, пераехалі з Міншчыны ў Кракаў. Пасля выхаду на пенсію Тадэвуш Кшыжаньскі пакінуў горад на Вісле і пасяліўся з жонкай у Альхоўцы каля лесу.

Мікалай Варанецкі

Найлепшыя

У Комплексе школ у Нараўцы (Гайнаўскі павет) падведзены вынікі конкурсу па зборы другаснай сыравіны. Вучні Пачатковай школы і Публічнай гімназіі сабралі 5 тон макулатуры і каля 12 тысяч пластмасавых бутэлек „Пэт". Найбольш актыўнымі былі вучні ПШ: Павел Засім (сабраў ён 1 707 кілаграмаў макулатуры), Каміля Кумэта (674 кг), Данель Барэчка (564 кг) і Юстына Тамберг (200 кг). Найбольш бутэлек назбіралі: Магдаліна Кумэта — 4 000 штук, Каміля Кумэта — 3 498 і Радаслаў Васько — 1 982.

Сярод гімназістаў па 200 кілаграмаў макулатуры даставілі на пункт зборкі Рафал Бядрыцкі, Магдаліна Каліноўская і Марцін Мішчук.

Узнагароды пераможцам конкурсу падрыхтаваў войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Сустрэча з гайнаўскімі вучнямі

Швед у гайнаўскай „двойцы”

Калі мы з Віктарам Шведам пераступілі парог гайнаўскай „двойкі”, нас акружылі дзеткі. Ужо з самага рання яны выглядалі паэта.

— А я таксама з Мора, — замест прывітання кінуў адважны хлапчук і хуценька паправіўся. — Значыць, адтуль мой дзед і бабуля.

У святліцы, дзе запрасілі нас настаўніцы беларускай мовы Аліна Якімюк і Зося Кердалевіч, разносіўся пах ружовых півоняў і флёксаў. Свойскія букеты красаваліся побач афіцыйнай *вянзанкі* герберaў.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пастаноўка ў „двойцы”

— Дзеці як даведаліся пра юбілей Віктара Шведа, то пабеглі яшчэ ў свае агародчыкі і назрывалі кветак, — кажа Аліна Якімюк. Пасля падораць іх паэту. Апрача бярэмя кветак, падораць яшчэ і нізку ягоных вершаў, якія вывучаць і прадэкламуюць перад усёй школай.

* * *

На сустрэчу з Віктарам Шведам прыйшла ўся школа. Дзеці, настаўнікі, дырэкцыя. Праўда, госця чакала нялёгкая задача, у зале панаваў гул як у вулеі. Нягледзечы на цяжкія ўмовы, паэт больш за гадзіну чытаў свае вершы ды расказваў аб сабе.

Самая сімпатычная частка сустрэчы адбылася ў вузкім крузе навучэнцаў беларускай мовы. Дзеткі пыталі пра бацькоў і сям’ю паэта. Цікавілі іх старыя імёны. Ахвотна апавядалі таксама пра сваіх бацькоў, бабуляў ды дзядуляў. Пасля паэт падпісваў свае зборнікі.

* * *

Наш візіт у гайнаўскай „двойцы” быў прымеркаваны да школьнага свята „Спатканне з родным словам”. Год у год навучэнцы беларускай мовы рыхтуюць мастацкую частку для сваіх сяброў. Наш — выпаў 15 чэрвеня. У гэты дзень на калідорах красаваліся каляровыя беларускія плакаты, якія размалявалі самі акцёры. Таксама спартыўная зала, дзе адбылося мерапрыемства, упрыгожылі вышыванымі ручнікамі.

Наколькі першая частка „Спатканняў” была прысвечана Віктару Шведу, дык другая адводзілася мастацкай прэзентацыі беларускага гуртка. Павяла яе адважная прыгажуня Іна Кавальская, якая апрача канферансье (у экстрэмальных умовах), праспявала яшчэ з сяброўкамі нізку беларускіх песень. Дзеці дэкламавалі вершы і паказалі дзве класныя пастаноўкі: „Хітры вол” і „Прынцэса Нехачу”. Запамяталася мне выступленне другакласніка Марыюша Харкевіча, які прадэкламаваў верш Ніла Гілевіча „Я беларус” і мазгавітыя браты-блізнюкі Павал і Пятро Аўксенцюкі.

— З іх пэўна вырастуць беларускія дзеячы! — пахваліла хлапчукоў спадарыня Аліна.

* * *

Хоць у гайнаўскай „двойцы” амаль тысяча вучняў, на беларускую мову ходзіць усяго за 70 школьнікаў (разам з гімназіяй).

— Затое гэта найлепшыя вучні, — адзначае спадарыня Аліна. — Яны прыходзяць на ўсе заняткі, нават калі гэта сёмы або восьмы ўрок...

Зараз многа ўвагі адводзіцца польска-беларускаму праекту.

— Хочам наладзіць супрацоўніцтва са школай у Пружанах, — кажа Зося Кердалевіч. Настаўніца апавядае аб праекце, які напісала разам з Алінай Якімюк. Завецца ён „З традыцыяй у будучыню”. Разам з вучнямі з Беларусі будуць знаёміцца з гісторыяй, культурай і прыродай сваіх рэгіёнаў.

— А якія падзеі спадарожнічалі вам на працягу школьнага навучальнага года?

— У нас многае дзеялася. — Пералічваюць: наведалі агратурыстычную гаспадарку ў Кархах, ездзілі ў Ляўкова, ладзілі вандроўкі па Белавежскай пушчы. Прымалі таксама ўдзел у „Мастацкіх сустрэчах”, якія арганізаваў Беларускі музей. Словам, заўсёды нешта дзеялася.

На канец я пачула вестку (дарэчы, сенсацыю!), што ўсе школьнікі пяройдуць у наступны клас. Зараз усе шпарка ідуць уперад!

Зорка

Віктар Швед падпісвае маладым чытачам свае кніжкі

Бэклівы бакас

Завуць гэтую птушку з сеўцападобных, бекасовых козкай ці баранчыкам: у час такавання падае гукі, якія нагадваюць бэканне. Вядомы ён у Еўропе і паўночных частках Азіі, аж да возера Байкал. Зімаваць выбіраецца ён часткова ў заходнюю Еўропу, але трапляе мясцамі ў Афрыку, Паўднёвую Азію і на астравы Палінезіі. Ёсць падвіды, якія жывуць у Амерыцы. Выглядам самец і самка не адрозніваюцца ад сябе, таксама маладыя ад старэйшых. Спінны бок звычайнага бакаса цёмна-буры з ржава-рыжымі стракацінкамі, і белаватымі падоўжнымі пасачкамі. Цемя чорна-бурае з вохрыстай падоўжнай палосачкай. Жывот і грудзі белаватыя з вохрыстым налётам і цёмнымі цяткамі. Крыло доўгае да 13 см, вага да 125 грамаў. У бакаса вельмі доўгая простая дзюба (да 7 см), шэра-карычневая з цёмным канцом. Рулявых пёраў 6-9 пар; найчасцей 7. Сярэднія рулявыя пёры чорныя з рыжымі вяршкамі, іншыя са светлымі. Выбіраючы месца для гнездавання, бакас непераборлівы; любіць ён багну, сырыя лугі, часта месцы парослыя рэдкім лесам. Корміцца чарвякамі, слімакамі, лічынкамі мух, камароў і іншых насякомых, часам здзюбвае несенне. Прылятае ў сакавіку-красавіку і наладжвае сям'ю. Веснавыя гульні пачынае яшчэ да прылёту на гнездавыя месцы. Такуючы самец раптам зрываецца з асаблівым стагнаннем з зямлі і хутка ўзлятае ўверх. Калі ўжо дасягнуў вышыні на пару дзесяткаў метраў, раптам пікіруе ўніз, крыху склаўшы крылы і патрасаючы імі, а хвост у той час раскрыты настолькі, што вярховыя крылы свабодныя, не кранаюцца адно аднаго. Прытым рулявыя, рассякаючы паветра і вібруючы, выдаюць той славуты дрыгатлівы гук, падобны на бляянне ягняці. Такое падзенне працягваецца 1-2 секунды, тады птушка зноў „чакаючы" ўсхопліваецца ўверх. Апрача таго самец вясною рассядаючыся на зямлі, на пні ці на дрэве з сухім верхам крычыць „таку-таку" ці рэзкае „цёк". Такія крыкі выдае таксама зрэдку летам. Гняздо вымошчвае бакасіха на нейкай купіне — гэта плоскае заглыбленне, высланае сухімі сцёбламі траў. У поўнай кладцы 4 грушападобныя яйкі, аліўкавыя ці аліўкава-вохрыстыя з шэраватымі плямкамі. Бакасоў можна лічыць манагамнымі птушкамі, хоць пару яны складаюць толькі на адно лета. Самец не прымае ўдзелу ні ў пабудове гнязда, ні пры наседжванні яек, якія самка грэе да 22 сутак. У мокрыя гады магчымы две кладкі. Птушаняты, абсохнуўшы, выходзяць з гнязда, а праз 19-20 дзён ужо падлётваюць. З вывадкам трымаюцца абое бацькі, а ў выпадку небяспекі пераносяць малых наляту, нізка над зямлёй, сціскаючы малечу паміж плюснамі ног. Бакас, за выключэннем шлюбнага перыяду, птушка маўклівая ды скрытая. Вельмі добра бегае ў траве, спужаны, можа не ратавацца ўцёкамі наляту. Узлятае, выдаючы своеасаблівае стагнанне, ляціць, перавальваючыся з боку на бок. Адпачываючы, часта стаіць стоены, крыху схаваўшы галаву ў спіну. У час кармлення, наадварот — вельмі ажыўлены, хуценька перабягае з месца на месца, хапае насякомых, бесперапынна совае дзюбу ў грунт, часта аж да самай падставы. Часта ходзіць па плыткай вадзе, заглыбляючы дзюбу аж да дна, глытае дробную здабычу, не выцягваючы дзюбу з вады ці мулу.

Адлятае бакас на зімоўку ў канцы жніўня — пачатку верасня, ды асобныя птушкі прытрымліваюцца да лістапада-снежня. На бакасоў палююць. Называецца гэта „спартыўным паляваннем".

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У чацвёртым класе Пачатковай школы ў Ягуштове

Вучні Пачатковай школы ў Бабіках на фоне Мірскага Замка

Першы раз у Беларусь

27-29 траўня г.г. мы, вучні Пачатковай школы ў Бабіках, якія ў гэтым годзе вывучалі беларускую мову, пабывалі ў Рэспубліцы Беларусь. Для многіх з нас была гэта першая экскурсія ў Беларусь. Мы доўга чакалі гэтай паездкі і многа рыхтаваліся.

Раніцай, у пятніцу, мы сустрэліся на вакзале ў Саколцы. Каля поўдня мы былі ўжо ў Гродне, тут чакала нас спадарыня Тамара Прадзед. Знаёмства з горадам мы пачалі з Дома-музея Максіма Багдановіча. Пасля мы паехалі ў самае прыгожае месца — Стары Замак. У ім мы пазнаёміліся з гісторыяй і мінулым Беларусі. Там мы таксама гулялі над Нёманам і пабывалі ў царкве на Каложы. Вечарам мы хадзілі па горадзе. Былі ў Фарным касцёле, у кнігарнях і крамах. Гродна нам вельмі спадабалася. Гэта прыгожы старажытны горад. У суботу мы паехалі ў Навагрудак. Былі ў месцах, дзе жыў Адам Міцкевіч — гэта Дом-музей Міцкевіча, гара і курган Міцкевіча. У Навагрудку нам найбольш спадабаліся руіны замка. Вечарам мы паехалі на возера Свіцязь, дзе купаліся і доўга гулялі. Яшчэ ніколі не бачылі такога цудоўнага возера.

У нядзелю мы паехалі ў Мірскі Замак. На месцы многа даведаліся пра яго гісторыю.

Экскурсія нам вельмі спадабалася. Мы купілі многа сувеніраў і зрабілі шмат здымкаў. Цяпер чакаем школьнага года і наступнай экскурсіі ў Беларусь.

Вучні Пачатковай школы імя Адама Міцкевіча ў Бабіках

Польска-беларуская крыжаванка № 26

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў, дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку № 22: Рыса, рэйка, сойка, назоў, сонейка, вясёлка, леапард, сок, ільгота, Аня, апалонік. Край, сіла, сяло, ой, нос, анёл, Рэ, зелень, слоўка, так, аркан, шмарагд, ял. Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі: **Караліна Янюк, Іаанна Леанеўская** і **Юлія Скепка** з Нараўкі, **Габрыель Ярацэвіч** з Бельска-Падляшскага, **Барбара Юрчук** з Кленік, **Эвеліна Ігнацюк** і **Паўліна Башун** з Чыжоў.

Меў я шчасце да добрых людзей

У сваё васьмідзесяцігоддзе расказвае Міхась Хмялеўскі...

Як рэалізаваліся мары хлопца з Паўднёвага Вострава, падкрынкаўскай вёскі? Час змяняецца, і жыццёвыя абставіны змяняюцца, і людзі змяняюцца, і іх мары таксама. Непараўнальна іншыя мары былі пры санацыйнай Польшчы, у час якой праходзіла маё дзяцінства. Цяжка жылося тады сялянам. Так званы „голад зямлі" зубожваў яшчэ больш нашых незаможных сялян. Вузкія палоскі з кожным новым пакаленнем дзялілі на яшчэ вузейшыя. Не было адплыву сялян на працу ў гарадах.

Малазямельныя мае бацькі, якія мелі ўсяго 4 гектары зямельных угоддзяў, яшчэ столькі ж наймалі і абсявалі, каб сяк-так можна было жыць, не галадаючы. Бедавалі яны над будучыняй сваіх трох сыноў, таму што чвэрць участка немагчыма падзяліць на тры часткі, проста — няма чым дзяліцца.

Вясковыя дзеці хадзілі ў чатырохкласныя паўшэхныя школы і адначасна многа працавалі пры розных гаспадарскіх работах. Многія пасвілі кароў, каб такім заробкам дапамагчы бацькам.

Гэтак і мне прыйшлося да ўсходу сонца ўставаць і гнаць пасвіць кароў на нашых вясковых лугах у Рахавіку і выгане. Прыйшлося мне жаць сярпом, кляпаць касу і ёю касіць сенажаць, малаціць цэпам, араць зямлю амаль драўляным плугам з перадком, баранаваць драўлянай бараной, сеяць жыта з каробкі, пілаваць дошкі спецыяльнай пілой, стоячы на калодцы, што ляжала на высокіх столках, а знізу брат Ёзік, а часам бацька цягалі пілу як сапраўдныя пільшчыкі. Вясковыя людзі ўсё самі рабілі, нават складаныя рамесніцкія работы выконвалі. Некаторыя нават самі коней падкоўвалі ды рамантавалі абутак. Гэтага патрабавала жыццё.

Вёскі былі перанаселены. Было многа моладзі, многа спеву, асабліва ў цёплыя перыяды года, калі моладзь збіралася каля хаты Леткавай Любы або Палосінай Мані, калі запяваламі былі гэтая ж Люба, Лёня Віктусёва і Віцька Сушынскі. Няраз бывала так, калі пазнавата вернешся адкульсьці, хуценька крышку перакусіўшы, бяжыш да спяваючай кампаніі і разам з ёю пяеш.

У нашай мясцовасці спакойна мінуў трагічны верасень 1939 года.

На Беласточчыне распачалося панаванне савецкай улады. Усе дзеці пайшлі ў школы і ўпершыню ў гісторыі ў нашай мясцовасці пачала вывучацца родная беларуская мова. Упершыню пазнаёміў нас з ёю Васіль Лукашук, які яшчэ да стварэння савецкіх асветных устаноў вёў ужо ў Паўднёвым Востраве заняткі на беларускай мове ад першага да чацвёртага класаў.

Праз некалькі месяцаў пазней, у вёсцы Гураны, адлеглай ад Паўднёвага Вострава на тры кіламетры, утворана была няпоўная сярэдняя школа, у якой навучалі, між іншым, дзве настаўніцы і двух настаўнікаў з Усходняй Беларусі. І ў Гуранах я таксама вучыўся.

У той час марамі маімі было вучыцца не толькі ў сярэдняй школе, але таксама закончыць вышэйшую навучальную ўстанову. Гэтыя мары і планы перакрэсліў выбух вайны 22 чэрвеня 1941 года. Наступіла страшэнная нямецкая акупацыя. Тады было адно жаданне: не загінуць, якнебудзь дачакацца вызвалення. Пасля вайны я вучыўся ў Беларускарускай гімназіі ў Беластоку, а потым у Варшаве на ўступным абучэнні для першакурснікаў ВНУ. Восенню 1948 г. Міністэрства асветы накіравала мяне ў СССР у Ленінград. Там у Ленінградскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Жданава закончыў я ў 1953 годзе аддзяленне журналістыкі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Такім чынам зрэалізаваліся мае мары здабыцця вышэйшай адукацыі.

У Ленінградзе сустрэў я шмат добрых людзей. Тут паявіліся таксама першыя парывы кахання, кахання глыбокага і шчырага. Савецкія законы ў той час не дазвалялі любіць замежнікаў і гэта лічылася парушэннем савецкіх законаў. Сувязі з ленінградцамі ў мяне ўтрымоўваюцца да сёння.

Закончыўшы універсітэцкую журналісцкую адукацыю ў Ленінградзе ў 1953 г., накіраваны быў я на працу ў Люблін, у рэдакцыю „Штандар люду". Працаваў я там усяго чатыры месяцы. Першая большая публікацыя была звязана з дапамогай мясцовых людзей польскаму войску і апублікавалі яе 12 кастрычніка — у дзень Народнага Войска Польскага. У сувязі з жаніцьбой з беластачанкай пераехаў я ў Беласток. Ад 1 лютага 1954 г. да 1 лютага 1956 г. працаваў я ў „Газеце беластоцкай". Ездзіў я ў так званы „тэрэн", таксама і на павятовыя партыйныя канферэнцыі, пісаў аб іх і аб жыцці вясковых людзей. У „Ніве" працаваў я ад першых дзён заснавання Георгіем Валкавыцкім рэдакцыі, значыць, ад 1 лютага 1956 года. З „Нівай" звязана было маё далейшае жыццё. Аб сваёй журналісцкай працы пісаў я ўжо ў „Беларускіх календарах" і з нагоды маіх юбілеяў — 70- і 75-годдзя. Успомню толькі аб некаторых рубрыках, якія я запачаткаваў. Доўгі час вёў я рубрыкі „Сардэчныя тайны", „Хроніка БГКТ", „Майстар на ўсе рукі", „І так бывае", „Гмінныя цэнтры", „Настаўнікі беларускай мовы", „Людзі БГКТ". Даўжэйшы час апекаваўся карэспандэнтамі „Нівы", якіх публікацыі друкаваліся пераважна на сёмай старонцы, арганізаваў інфармацыі ад карэспандэнтаў і чытачоў. Часта выязджаў у камандзіроўкі аўтобусамі і цягнікамі на некалькі дзён.

Сустракаючыся з нечым асабліва добрым, высокім, чалавечым, не мог я прамаўчаць, не мог не напісаць, бо хацелася б, каб людзі рабілі ўсё толькі добрае, каб пазбыліся жорсткага эгаізму, чэрствасці, каб не на хвалях злосці, а дабрыні вырашалі ўсе нялёгкія жыццёвыя справы, каб бралі ў прыклад сабе людзей сумленных, справядлівых, таму што няма на зямлі нічога даражэйшага за людзей з добрымі душамі і прыгожымі думкамі. Гэтыя словы выказваў я ўжо ў адной са сваіх публікацый. Пісаў я шмат пра добрых людзей, а таксама аб вялікіх цяжкасцях, аб горы людзей, аб іх бедах і складаных справах. У размове з імі прыйшлося мне не толькі ім спачуваць, але таксама дапамагаць. Прыязджалі яны да мяне ў рэдакцыю, і я, уважліва выслухаўшы іх, намагаўся ўявіць сябе ў іх палажэнні, на іх узроўні свядомасці і адукаванасці. Пры народнай Польшчы было куды пайсці са скаргаю, было каму дапамагчы. Партыйныя органы маглі адразу дапамагчы, але маглі таксама адразу знішчыць чалавека. Помню, прыйшоў быў у рэдакцыю старэнькі чалавек (я ўжо забыўся, як называлася гэтая вёска за Райскам, недзе каля Плютыч), якому не хацелі выдзеліць вугалю і прывезці яго. Усюды ён хадзіў і нічога не ўладзіў: „Адзін чыноўнік адпраўляе да другога, другі да трэцяга. Трэці таксама намагаецца пазбыцца мяне, нагаварыўшы бочку арыштантаў і адправіць. Адзіная на вас надзея!" — сказаў амаль благальна старэча. Пазваніў я ў адпаведныя ўстановы і справу, сказалі, уладзяць на працягу некалькіх дзён ды паінфармуюць мяне аб гэтым. Так і было. А зноў адна калекая жанчына з Беластоцкага павета, якая сама выхоўвала двое дзяцей, не магла дабіцца таго, каб атрымаць успамогу. Прайшло некалькі тыдняў, калі мая пісьмовая інтэрвенцыя дала жаданы вынік. Жанчына не магла аддзякаваць мне.

Многім вяскоўцам дапамог я ўладзіцца на работу, вучням — атрымаць інтэрнат. Многа злучыў я пар, многа разоў быў я сватам (маршалкам, перавязаным ручніком) на вяселлях. Але ўчыненае дабро недзе правальваецца, быццам у нейкую канаву. Аднак з многімі я спатыкаючыся, адчуваю іх удзячнасць. Нядаўна на дафестывальных элімінацыях конкурсу „Беларуская песня 2005" спаткала мяне асаблівая неспадзеўка. Заўважыў я, што нейкая жанчына праходжвалася то адным бокам залы, то другім і прыглядалася людзям. Сядзеў я ў першым радзе з віцэ-консулам РБ. Раптам жанчына падыходзіць да нас і пытае ці я Хмялеўскі Міхась. Пацвярджаю гэта і яна просіць мяне на хвілінку падысці да акна, дзе стаяла некалькі асоб. Адзін чалавек з радаснай мінай стаў вітаць мяне і абое з жанчынай сталі мяне цалаваць. „Вы нас пажанілі, мы часта вас успамінаем і да магілы будзем вам удзячны за гэта, бо мы жывем вельмі згодна, вельмі шчасліва. Было гэта дваццаць сем гадоў таму назад, калі мы жылі на Дуброўшчыне — я ў Грабянях, а ён — у Крапіўнай. Вы яго да нас прывезлі і пазнаёмілі нас, і мы падружыліся, і пажаніліся. Каб вам Бог даў здароўечка, даражэнькі пане Хмялеўскі! Ад нядаўна жывем мы ў Беластоку. Парадкуем сваю кватэру, і калі давядзем яе да парадку, запросім вас у госці!" — сказала жанчына.

Хачу сказаць, што беларусы вельмі здольны і гасцінны народ. З кім я не спаткаўся, тыя неяк станавіліся маімі сябрамі, прыяцелямі. Ды, мусіць, меў я шчасце да добрых людзей.

Выслухала Міра Лукша

Дарагому Юбіляру

Час крадзе нам дзень за днямі,
Дажываем круглых дат.
І ўжо, Міхасёк за намі
Роўнае Васемдзесят.

Наступае жыцця восень,
Міма нашых засцярог,
Колькі яшчэ засталося —
Знае толькі адзін Бог.

А жыць хочацца усё-ткі,
Дзе народ наш, родны кут.
Век людскі такі кароткі,
Госці мы на свеце тут.

І нягледзячы на гэта,
Што цяжэй жыць з кожным днём,
Чуем непрыхільнасць свету,
Хочам цешыцца жыццём.

Жыць без боляў і без сваркі,
Заўжды дружнаю сям'ёй,
Выпіць часам яшчэ чарку
У кампаніі сваёй.

І таму, мой мілы Братка,
Будзь вясёлы і здароў
Каб яшчэ хоць дзве дзесяткі
На зямлі пражыць гадкоў!

Віктар Швед, 26.VI.2005 г.

Польска-беларускаму садку № 14 у Беластоку споўнілася дзесяць гадоў. Гадавіну адзначылі ў Ліпавым Мосце непадалёк Супраслі 18 чэрвеня г.г.

Марылі пра беларускае прадшколле

Размова з доктар Барбарай ПЯКАРСКАЙ, адной з заснавальніц Польска-беларускага садка № 14 у Беластоку і шматгадовай старшынёй Бацькоўскага камітэта.

— Што лічыш найбольшым дасягненнем садка?

— Тое, што на прадшколлі не канчаецца адукацыя на беларускай мове. Ёсць пачатковая школа, ёсць гімназія — думаем пра ліцэй.

Калі мы пачыналі дзесяць гадоў таму, нават не марылі пра такі поспех. Нашы першыя думкі былі настолькі сціплыя, што калі пра тое падумаеш, не верыцца, што тое ўсё трывае і развіваецца.

— Наколькі памятаю, першыя гады трэба было змагацца за кожнае дзіця, заўсёды не хапала такой колькасці, каб наладзіць працу ў двух аддзелах.

— Тут была яшчэ дадатковая праблема, такі недахоп уяўлення з боку тадышніх дырэктараў. Першыя пяць гадоў мы жылі ў страху, што калі мы не зможам знайсці па дваццаць дзяцей у групу, нам не дазволяць утрымаць навучанне.

Думаю што гэта былі такія тэарэтычныя страхі, каб мы баяліся.

— Спачатку ўсе заняткі вяліся па-беларуску?

— Мая мара была такая, каб прадшколле было беларускае, каб усе заняткі былі па-беларуску, каб настаўніцы гаварылі з дзяцьмі па-беларуску, каб дзеткі між сабой гаварылі па-беларуску. А ведаю што гэтага няма. Можа не бачу ў тым сваёй віны, ад трох гадоў не бываю ў прадшколлі. Думаю, што такая патрэба павінна выходзіць ад персаналу і бацькоў, якія пасылаюць дзяцей у садок. Вельмі шкада, што беларускасці ў садку ўсё менш і менш. Бо калі бацькі пасылаюць дзіця толькі дзеля рэлігіі, дык які сэнс, рэлігіі навучаюць у кожным іншым прадшколлі ў Беластоку?

Гэта настолькі спецыфічны садок, што калі хтосьці пасылае туды сваё дзіця, дык мае свядомасць, што трэба дапасавацца да пануючых там узораў.

Калі чую галасы бацькоў, што нібыта замнога там беларускасці, тады я гэтага зусім не разумею! Сапраўды, ёсць такі вялікі выбар прадшколляў дзе няма беларускай мовы.

А на тое, каб дзіця навучылася дзвюх-трох песень, няма патрэбы хадзіць у садок, кожны можа навучыць гэтага ў хаце.

Я лічу, што беларускасці ўсё ж замала, аднак я не маю на гэта ўплыву.

Першыя пяць гадоў тон задавалі бацькі, якія заснаўвалі прадшколле. Тут мова не адно пра ўплыў на праграму навучання, бацькі сваімі сіламі аднаўлялі і абсталёўвалі прадшколле. Гэта быў адзін з найгоршых будынкаў, памятаю як бацькі пераводзілі дзяцей у іншыя садкі з прычыны старых цацак.

— Як успрымаеш факт, што няма ўжо Бацькоўскага камітэта?

— З майго пункту гледжання бацькі могуць вельмі многа дапамагчы, гэта вельмі вялікая сіла і калі яе пазітыўна скарыстаем, усім будзе карысна. У нас быў вельмі актыўны камітэт, часам нашы адносіны з настаўнікамі былі напружанымі, аднак нам страшэнна залежала, каб той садок існаваў, мы рабілі ўсё, каб яго ўтрымаць. Нават прыдумалі формы дадатковых заняткаў. Вядома, што ўсе спектаклі адбываліся пасля працы і гэта абазначала дадатковую працу для настаўніц і бацькоў. Ангажаваліся ўсе.

Аднак мы мелі свядомасць, што ўсё што робім, робім для сваіх дзяцей. Думаю, што і сёння бацькі ангажуюцца, дык можа зараз няма там такіх моцных людзей, якія пацягнулі б справу. Скажу так: прадшколле ёсць такое, якія ў ім бацькі і настаўнікі.

На II Сустрэчу з'ехалася больш за 100 выпускнікоў і сённяшніх навучэнцаў садка. Апошнія, разам з бацькамі, паказалі этнапастаноўку „Вяселле" ды развіталіся з сёлетнімі выпускнікамі. „Ніва" закранула пытанне перспектываў існавання і развіцця прадшколля...

Размова з Луцыяй НЕМІРОВІЧ, дырэктарам (ад трох гадоў) Польска-беларускага садка № 14 у Беластоку.

— У гэтым годзе, здаецца, у вас больш ахвотных, як месцаў у прадшколлі. Колькі дзетак запісалася на наступны год?

— Маем ужо 56 дзетак. Прытым у малодшай групе будзе аж 32 асобы і частку мы вымушаны перавесці ў старэйшую групу, проста, не хапае там усім крэслаў.

— Што робіце, каб прыцягнуць кандыдатаў?

— У асноўным гэта праца настаўніц. Найважнейшая — атмасфера ў прадшколлі. Мы вялікай рэкламнай акцыі не вядзем, інфармацыя пра наш садок ідзе прыватным каналам. Важная ёсць інтэграцыя з бацькамі, з якімі робім спектаклі і людзі гэта бачаць, пра гэта размаўляюць.

— Ці ўсе заняткі праводзіце па-беларуску?

— Ёсць такія дзеткі, якія разумеюць мову, але прыходзяць да нас і такія, якія пачуўшы выказванне па-беларуску пытаюць: *Co, pani mówi do nas po angielsku!* Настаўніцы пачынаюць з простых слоў, чытаюць казкі, вучаць вершаў, песень. У нас сітуацыя складаная, на пачатку амаль ніхто не разумее мовы. Тыдзень таму я была на ўроку ў малодшай групе і хачу сказаць, што яны ўжо разумеюць, некаторыя гавораць.

— Пачаткова ўся праграма вялася па-беларуску, а як справа маецца сёння?

— Ёсць многа элементаў на беларускай мове. Ёсць розныя дзеткі. Прыходзяць таксама такія бацькі, якія самі не ведаюць мовы і дзеці яе не чулі. Тут проста не было б камунікацыі. Мы са свайго боку не хацелі б іх *адстрашыць*, проста робім усё, каб яны не знеахвочваліся і паэтапна вывучалі мову.

— У апошнія гады маеце многа поспехаў, вашы дзеці заваёўваюць усе галоўныя ўзнагароды ў беларускіх конкурсах.

— Нашы дзеткі выступаюць таксама ў агульнаваяводскіх мерапрыемствах і займаюць там першыя месцы. Наша выпускніца Магда Бабік у гэтым годзе заваявала першае месца ў Алімпіядзе англійскай мовы. І зараз яна будзе прадстаўляць цэлы Беласток на цэнтральным этапе.

— Ці маеце дадатковыя сродкі на свае мастацкія праекты?

— Не, не маем, раней мы мелі падтрымку Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь, а зараз усё ладзім сваімі сіламі. У гэтым годзе ў конкурсе праектаў мы атрымалі тысячу злотых на правядзенне Фестывалю для прадшколляў нацыянальных меншасцей.

— Так многа гаворыцца пра шматкультурнасць Падляшша. Ці з боку ўлад маеце рэальную падтрымку, ці цікавяцца вашым існаваннем улады горада?

— Зацікаўлення няма, але дабіваемся свайго, дапамога ёсць.

— Які працэнт выпускнікоў пойдзе ў „чацвёрку"?

— У гэтым годзе сто працэнтаў, значыць, адзінаццаць выпускнікоў.

— Якія бачыце перспектывы?

— Паціху думаю, што за пяць гадоў мы адкрыем трэці аддзел.

— Скажыце, чаму няма Бацькоўскага камітэта?

— Думаю, што галоўнай прычынай з'яўляецца праблема часу. Сёння ўсе наракаюць на нястачу часу. Калі б такі камітэт быў, для мяне была б гэта вялікая выручка і палёгка.

Інтэрв'ю і фота Ганны Кандрацюк

bma.home.by

Набліжаецца адна з галоўных падзей у музычным жыцці аматараў беларускай маладзёжнай музыкі — чарговы фестываль „Басовішча". Штогод гэтая падзея прыцягвае да сябе выканаўцаў не толькі з Падляшша, але і з Беларусі.

Пэўна адным з найбольш „дасведчаных" крыніц пра музыку і спевы, у многім падобных на тыя, што гучаць на „Басовішчы", можна назваць сайт „Беларуская Музычная Альтэрнатыва" (БМА). Сайт гэты месціцца па адрасе http://bma.home.by.

Варта адзначыць, што першая старонка выкананая даволі сціпла. Неяк запала ў свядомасць, што ўсе рок-музыканты гэта людзі, якія любяць колеры, што „крычаць" — чорны, чырвоны і г.д. У даным выпадку ўсё неяк памяркоўна. На ледзьве блакітным фоне выяўлення месяца навіны за прайшоўшы з пачатку года перыяд. Уверсе таксама не вельмі кідкі надпіс назвы сайта, а пад ім выйсці да нешматлікіх рубрык. Праглядаючы сайт уважліва можна адшукаць праўдападобны адказ на такую сціпласць, што мы потым і зробім.

Стужка навін абнаўляецца даволі часта і тычыцца выключна падзей музычнага жыцця. Тут распавядаецца ў асноўным пра новыя альбомы гуртоў, месцы і час канцэртаў і выступленняў. Крыху дзіўна, але ўверсе літаральна пад назвай рубрыкі адразу месцяцца выйсці да паведамленняў мінулых гадоў, так званы архіў навінаў. Звычайна выйсце да такога раздзела знаходзіцца каля тых інфармацый, што прыйшлі раней.

Вельмі цікавай можна назваць рубрыку „Гурты", хоць гуртоў там не так многа, як хацелася б. Гэта папрок у адрас стваральнікаў сайта — калі стварылі рубрыку, то падтрымлівайце яе ў належным стане, бо ўзнікае адчуванне, што беларускіх рок-гуртоў толькі чатыры штукі. Але калі праглядаць інфармацыю менавіта пра гэтыя чатыры „прывілеяваныя" музычныя калектывы — „Новае неба", „Ліцвіны", „Палац" і „Жыгімонт Ваза" — то з прыемнасцю можна адзначыць яе падрабязнасць. Аб кожным гурце распавядаецца цікава, усе іхныя старонкі аздобленыя фотаздымкамі і пералікам выдадзеных дыскаў. Да тых гуртоў, што маюць уласныя сайты ў Інтэрнэце, — маюцца выйсці.

Як вядома, шоу-бізнес справа даволі прыбытковая. Тут нічога кепскага няма, бо калі людзі плацяць за прыемную ім музыку, то дзякуй тым, хто наважваецца яе распаўсюджваць, асабліва калі словы да гэтай музыкі беларускія. Таму, каб выбраць для сябе нешта па густу, трэба зайсці на старонку „Каталёг прадукцыі". Ён даволі вялікі і змяшчае запісы па шэрагу накірункаў музычнага мастацтва: песні бардаў, поп, фольк, фольк-рок, рок і іншыя стылі.

Кожная старонка і пералік рубрык мае выйсце да „Кантактаў". Такое інфармаванне дае падставу сцвярджаць, што распрацоўшчыкам вельмі залежыць, каб з імі звязваліся.

Ёсць на кожнай старонцы і ледзьве заўважнае выйсце да старой версіі сайта. І калі мы выйдзем да яе, то колеры будуць якраз „рокавымі". Праўдападобна, новая версія знаходзіцца ў самым пачатку свайго існавання, чым і тлумачыцца незвычайная колерная сціпласць. Шчыра кажучы, стары сайт аздоблены больш. Мае нават яшчэ расійскую і англійскую версіі. Але самае галоўнае, што дае вычарпальную інфармацыю пра БМА — маладзёжную арганізацыю, асноўная мэта дзейнасці якой — падтрымка нацыянальнага рока і распаўсюджванне дэмакратычных ідэяў праз рок-музыку.

Уладзімір Лапцэвіч

Мужчынская каманда Беларусі (яе вышэйшае дасягненне ў гісторыі — 2-е месца ў першай лізе ў 1993 годзе) здолела зараз перамагчы ў другой лізе...

Беларусь, беларусы...

Мужчыны пайшлі ўгору

Беларуская лёгкая атлетыка, якая мае ўстойлівыя традыцыі і якая, як і ў многіх еўрапейскіх краінах, ёсць прыярытэтным відам спорту, перажывае зараз пэўны ўздым. Раз-пораз прыходзяць навіны пра поспехі суайчыннікаў. Так днямі марафонка з Гродна Галіна Карнацэвіч стала пераможцай забегу Grandma's Marathon, які прайшоў у амерыканскім горадзе Дулуце. 35-гадовая спартоўка прытым палепшыла свой рэкорд марафонскага бегу больш чым на 6 хвілін. Усталяванне новага асабістага дасягнення адначасна з перамогай прынесла Карнацэвіч 10,5 тысяч долараў прэміяльных.

Высокага роўню лёгкаатлетак Беларусь зараз мае на спрынтэрскіх дыстанцыях. Акрамя алімпійскай чэмпіёнкі „белай маланкі" Юліі Несцярэнкі, гэта чэмпіёнка свету Наталля Сафроннікава, віцэ-чэмпіёнка кантынента Святлана Усовіч, фіналістка першынства Еўропы Алена Неўмяржыцкая, бронзавая медалістка маладзёжнага чэмпіянату Еўропы Аксана Драгун, прызёры чэмпіянату свету Наталля Салагуб, Ілона Усовіч, Ганна Казак, таленавітая юная Юліяна Жалнярук. Ніколі яшчэ Беларусь, нават у часы поспехаў алімпійскай чэмпіёнкі Тацяны Ледаўской, не мела такога набору высакакласных спрынтэрак. Праўда, на нядаўна прайшоўшых спаборніцтвах Кубка Беларусі яны выступалі не ўсе. Сафроннікава рыхтуецца нарадзіць дзіця, а старэйшая з сясцёр Усовіч — Святлана ў гэты час паспяхова выступіла на міланскім і севільскім турнірах серыі Гранпры. Што датычыць Несцярэнкі, то яна трэніруецца і выступае па індывідуальнаму графіку. Юлія не выступала дзевяць з паловай месяцаў, а першы пасля трыумфу ў Афінах выхад на публіку адбыўся толькі зараз, на буйным прадстаўнічым турніры ў ЗША. Несцярэнка паказала толькі сёмы вынік, але галоўныя старты сезона яшчэ наперадзе.

Што датычыць Кубка краіны, то праходзіў ён у Брэсце, менавіта гэты горад зараз становіцца лёгкаатлетычнай сталіцай краіны. Гаспадары стадыёна, які неўзабаве рэканструуецца з тым разлікам, каб прымаць салідныя міжнародныя спаборніцтвы, дамінавалі ў большасці дысцыплінаў. У выніку ўпэўненае першае агульнакамандавае месца Брэсцкай вобласці. Другімі сталі прадстаўнікі Мінска, трэцімі — атлеты з Мінскай вобласці. Галоўнай мэтай Кубка Беларусі быў адбор у нацыянальную каманду для выступу на Кубку Старога свету.

Кубак Еўропы — гэта даволі своеасаблівыя і цікавыя спаборніцтвы. Усе краіны ў адпаведнасці з дасягненнямі падзеленыя на некалькі групаў — Суперліга, Першая ліга, Другая ліга. Жаночая беларуская дружына (вышэйшае яе дасягненне 3-е месца ў Суперлізе ў 1996 годзе) выступала зараз у першай лізе. У спаборы (ён прайшоў у партугальскай Лейрыі) з Бельгіяй, Нідэрландамі, Вялікабрытаніяй, Ірландыяй, Балгарыяй, Сербіяй і Чарнагорыяй, Партугаліяй нашы дзяўчаты не здолелі здабыць адзіную пуцёўку ў вышэйшы дывізіён, заняўшы другое месца. А вось мужчынская каманда Беларусі (яе вышэйшае дасягненне ў гісторыі — 2-е месца ў першай лізе ў 1993 годзе) здолела зараз перамагчы ў другой лізе. Беларусы ў Стамбуле апярэдзілі ўсіх — Азербайджан, Боснію і Герцагавіну, Балгарыю, Албанію, Арменію, Грузію, Малдову, Кіпр, Андору, Турцыю, Македонію і зборную малых краін Еўропы. Такім чынам заваявана месца ў Першай лізе, дзе беларусы ў наступным годзе напэўна замацуюцца.

Уладзімір Хільмановіч

Размова з папугайчыкам

Для беларускага апазіцыянера раптоўны стук у дзверы заўсёды ёсць нечаканай чаканасцю. Таму Віталік Тарасаў, як адчыніў дзверы і ўбачыў малаарослую носазадзёртую постаць, якая нетыповымі для нармальнага чалавека паводзінамі выдавала дзяржаўнага чыноўніка невысокага рангу і інтэлекту, ані трошкі не здзівіўся.

— Вы даўно да нас з Расіі? — не даўшы таму раскрыць наўмысна згрымашаныя паказной суровасцю вусны спытаўся Віталік.

Нязваны госць пачаў абдумваць пытанне гаспадара кватэры. У яго нават зморшчылася шкура на ілбе і вылупіліся ад напружанай працы мазгоў вочы, але рот нечакана выдаў падрыхтаваную заранёў фразу:

— Здравствуйте! Я судебный исполнитель. Я уполномочен, указанными в этом документе органами, известить вас о том, что истекли все сроки выплаты наложенного на вас штрафа по статье..., э..., указанной в ранееупомянутом документе, за произведённый вами несанкционированный митинг на улицах города, с применением незарегистрированной бело-красно-белой символики...

— Пачакайце хвіліначку, — ледзьве стрымліваючы смех ад пачутае бязглуздзіцы перабіў яго Тарасаў. — А то зараз выпусціце ўвесь пар, як дзіравая лазня, растраціце ўсё вашае нязвыклае прыгожаслоўе, а растлумачыць чаго вы да мяне завіталі так і не здолееце.

Судовы выканаўца на хвіліну збянтэжыўся. Але ўспомніўшы, што ён „при исполнении служебных обязанностей", ды мае пэўную ўладу, сунуў апазіцыянеру нейкую паперыну з блакітнай размазанай кляксай (хіба пячаткай) і без запрашэння ўхамаваўся ў кватэру.

— А вы откуда взяли что я из России? — нарэшце здолеў пераключыцца на Віталікавае пытанне чыноўнік. Ён, спрактыкаваным як у злодзея вокам, аглядаў кватэру апазіцыянера, падлічваючы ў галаве кошт маёмасці.

— Бо ў нас не трэба малаціць галавой у дзверы, каб табе адчынілі. Можна націснуць пальцам такую невялічкую „пімпачку" і задзінькае званочак. А што гэта вы так па-воўчаму на мае рэчы ўзіраецеся? Ці не рабаваць прыйшлі?

— Если вы не выплатите штраф, мы будем описывать ваше имущество, — заявіў судовы выканаўца, дабавіўшы свайму голасу максімум жорсткасці. Яму здавалася, што ад гэтага не толькі Віталік, але і сцены кватэры напалохаюцца. Але голас яго быў настолькі нудна-казённы, што ад яго магла толькі разбалецца галава. Нават у каменя.

— А навошта яго абпісваць? — зарагатаў апазіцыянер. — Вы хіба толькі і робіце, што абпісваеце ўсё ўбачанае. Вось і поўзаеце па свеце Божым увесь абпісяны.

Чыноўнік зноў зморшчыў лоб. Было бачна па яго твары, як кожны пераклад беларускага слова выклікаў жудасны галаўны боль.

— Вы, вообще, нормальным языком говорить можете, — урэшце вымавіў ён, яўна не адолеўшы перакладу папярэдняй фразы.

— Ды нармальны ў мяне язык, — працягваў смяяцца Тарасаў. — Я штодзень паласкаю рот адмысловай вадкасцю, і язык правяраю. Ён у мяне чырвоны, як мае быць.

— Да что вы несёте? Я спрашиваю, вы по-русски можете разговаривать? — судовы выканаўца счырванеўся ад злосці, як дзіцячы азадак, па якім бацька сцебануў дзяжкай. — Придумали себе язык какой-то. И ещё хотите чтобы дети в школе его изучали. А знаете какая у них сложная программа и без вашего белорусского. Вы их травмируете. У них-то головки ещё маленькие.

Віталік аж зайшоўся ад смеху, бо прадбачыў што будзе далей. Ён падыйшоў да птушынай клеткі і адчыніў дзверку. Невялічкі зялёненькі папугайчык выляцеў адтуль і сеў на плячо чыноўніка.

— Добры дзень! Я птушка! — выкрыкнуў папугайчык і зазірнуў няпрошанаму госцю сваім маленькім вочкам прама ў вуха. Нібы правяраў, ці не глухаваты чалавек завітаў у хату. Папугаі любяць новых людзей і вельмі з імі гаваркія. Ім вельмі падабаецца, як людзі, пачуўшы ад іх чалавечыя словы, пачынаюць смяяцца і хваліць. Вось і гэты, нібыта пераканаўшыся што з вушынай перапонкай у госця ўсё нармальна, прынамсі ў адным вуху, выгукнуў з усяе моцы:

— Жыве Беларусь!

У чыноўніка так перакасіла твар, што спалоханая птушка сіганула зноў у клетку. А той аж зароў:

— Ни хрена себе! Во бля... Да вы что, и попугая научили разговаривать по-вашему?

— Сам навучыўся, — ужо здыхаючыся ад смеху патлумачыў Віталік. — І галава ў яго здаецца малая. А ў некаторых людзей галовы большыя ад конскіх, а адолець мовы не ў стане. Відаць, мазгоў менш, чым у папугая.

Судовы выканаўца хапіў свае паперы і з такім выразам на твары, як быццам з'еў гаўна, выскачыў з кватэры.

— Ну што, птушка, — звярнуўся гаспадар да папугая. — Вось прыйшоў прыдурак нешта там абпісваць, а пайшоў сам абпісяны.

— Абпісяны, — паўтарыў папугайчык, і зноў выскачыў з клеткі.

Генрых Западашмянскі

Раздзяліла граніца

У Мацкевічах, якія афіцыйна называюцца Доўгім Бродам, жывуць у асноўным пенсіянеры. Толькі двух гаспадароў па-сур'ёзнаму займаецца сельскай гаспадаркай і некалькі асоб даязджае на працу ў Гайнаўку. У нейкай ступені да гаспадарчага заняпаду ў Мацкевічах і навакольных вёсках спрычынілася ўстанаўленне шэсцьдзесят гадоў назад дзяржаўнай мяжы, якая раздзяліла Белавежскую пушчу на дзве часткі. Яшчэ і зараз жыхары Гайнаўшчыны з настальгіяй успамінаюць часы, калі маглі без перашкод наведваць сямейнікаў і сяброў, якія зараз жывуць у Беларусі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Зараз у Мацкевічах (Доўгі Брод) у асноўным жывуць пенсіянеры

Сябравалі і жаніліся

У Мацкевічах усе ведаюць, што пасля ўстанаўлення дзяржаўнай мяжы ў сярэдзіне Белавежскай пушчы многа сямейнікаў Васіля Хмары засталося жыць у Беларусі.

— Мой бацька выводзіцца з вёскі Мшанкі, якая зараз знаходзіцца на беларускім баку. Прыехаўшы ў Мацкевічы, працаваў ён гаёвым. У савецкі час майго бацьку звольнілі з працы і тады заняўся ён сельскай гаспадаркай, — кажа Васіль Хмара. — Каля Мшанак знаходзіліся Панасюкі, Чвэркі, Камянюкі. У прыхадской царкве ў Белай адзначалася свята ў гонар святых Макавеяў і ў гэты дзень наша сям'я ездзіла наведваць сваіх суродзічаў. У майго дзеда, што жыў у Мшанках, была вялікая груша. Вяртаючыся са святкаванняў, прывозілі мы дамоў вялікую колькасць груш. Добра памятаю дзеда Карніла, які таксама быў гаспадаром. Землі ў Мшанках былі дрэнныя, давалі невялікі плён. На лясных палянах пушчы людзі пасвілі кароў.

Суадносіны паміж жыхарамі прыпушчанскіх вёсак, што зараз знаходзяцца ў Беларусі і жыхарамі вёсак Гайнаўшчыны былі вельмі добрыя. Людзей яднала Белавежская пушча і супольная беларуская культура, якая ўзнікала стагоддзямі на прыпушчанскіх землях.

— Найчасцей нашы дзяўчаты выходзілі замуж, а хлопцы жаніліся ў вёсках, што зараз за ўсходняй мяжой. Нават менш нашых дзяўчат выходзіла замуж у вёскі распаложаныя вакол Гайнаўкі. Моладзь з вёсак, якія зараз за мяжой, прыязджала да нас на забавы з акардэонамі. Вясельныя і іншыя абрады ў Мшанках ці Панасюках былі падобнымі да нашых. Гаворка там была дакладна такая, як у нас. Мы ўсе лічылі сябе беларусамі, — гаворыць Васіль Хмара. — Перад вайной наша прыхадская царква была ў Мелянцу, што зараз у Беларусі. У Вэрстоку была толькі прыпісная царква і святар прыязджаў сюды служыць толькі ў час важнейшых святаў.

Раздзяліліся сем'і

Пасля вайны праз Белавежскую пушчу пралягла шчыльная мяжа. Нават жыхарам, што жылі непадалёк ад граніцы, забаранілі перасякаць яе.

— Мяжа, што раздзяліла нашы землі, неўзабаве пасля яе ўстанаўлення была зменена. Спачатку больш пушчанскіх вёсак было далучаных да Польшчы. Пасля Бобінка, Смаляціна і Акаставец былі далучаны да Беларусі. У жыхароў, што жылі бліжэй мяжы, поле апынулася ў Беларусі і трапіла ў калгасы. Грамадзяне Польшчы за страчаную зямлю атрымалі нейкую кампенсацыю. Людзям хацелася наведаць сваякоў за мяжой, але можна было да іх дабірацца толькі акружнай дарогай і ўезд у Савецкі Саюз быў надта складаны, — тлумачыць спадар Хмара. — Спачатку жыхарам вёсак, што апынуліся ў Беларусі, жылося вельмі дрэнна. Мусілі яны змагацца з голадам, бо харчаванне вывозілі ў гарады. У калгасах жартавалі: „Што ў веялцы на дне — даюць за трудадне". Пасля ўмовы жыцця паправіліся. Мой сваяк Васіль, якога я наведаў у Беларусі, абкошваў равы, а яго жонка працавала ў цялятніку. Апрача работы ў калгасе ў Асенніках, гадаваў ён дзве каровы.

У шасцідзесятых гадах здарылася такое, што два дні савецкія пагранічнікі прапускалі праз мяжу ў Польшчу, без запрашэнняў, жыхароў вёсак распаложаных побач пушчы ў Беларусі.

— Проста калгаснікі ў час сенакосаў падпаілі савецкіх пагранічнікаў і яны пусцілі іх да нас. Два дні нашы сваякі гасцявалі ў Мацкевічах. Да нас прыйшоў сваяк Кузьма са Смаляціна і мы пасядзелі разам з ім. Польскія пагранічнікі са Старыны думалі, што пераход жыхароў Беларусі легальны. Пасля ў Беларусі апамяталіся. Знялі камандзіра пагранічнай заставы, паставілі на яго месца вайсковага каўказскай нацыянальнасці і пераход у Польшчу спынілі. Нашы пагранічнікі ездзілі па вёсках і пыталі пра нелегальнае перасячэнне мяжы, але ніхто не прызнаваўся, што да нас прыходзілі сваякі, — успамінае спадар Васіль.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Васіль Хмара пражыў у Мацкевічах семдзесят пяць гадоў і добра памятае пра жыццё ў мінулым

Жыхары Гайнаўшчыны больш масава пачалі наведваць сваякоў у Беларусі ў сямідзесятых і васьмідзесятых гадах.

— Пасля вайны я баяўся ехаць да сваякоў у Беларусь, каб не затрымалі мяне там. У сямідзесятых гадах, калі ў Савецкім Саюзе стала больш спакойна, рашыўся я пабачыць, як жыве мая радня. Разам з пляменнікам Васілём Панасюком заехалі мы ў Камянец і я хацеў зайсці ў царкву. Сваяк раіў мне пакінуць гэтую задуму, звяртаючы ўвагу на апранутага па цывільнаму міліцыянера, які сачыў за намі. Яшчэ тады глядзелі за ўсімі людзьмі, што прыязджалі ў Савецкі Саюз з захаду, — кажа Васіль Хмара. — Пасля вайны нашы сваякі перасталі хадзіць у царкву, апасаючыся звальнення з працы. У храмах Беларусі можна было спаткаць толькі старэнькіх людзей, якіх савецкія ўлады пакінулі ў спакоі.

Нядаўна ў Дубічах-Царкоўных пабудавалі пагранзаставу, каб граніцу з Беларуссю зрабіць больш шчыльнай. Людзі хацелі б, каб перасяканне мяжы стала больш свабодным і каб зрабілі дадатковы пагранпераход.

— Мы хацелі б, каб непадалёк ад нашых вёсак адчынілі пераход праз мяжу і можна было наведаць людзей у Беларусі, што жывуць недалёка ад нас. Нядаўна адчынілі пераход праз граніцу ў Белавежы. У нас людзі шкадуюць, што нельга праз яго на ездзіць машынах, — гаворыць спадар Васіль.

Пусцеюць пушчанскія вёскі паабапал мяжы

— Мацкевічы, Забагоншчына, Якубова, Пяскі і Вілюкі заснаваны пры панаванні ў Расіі Екацерыны II. Спачатку ў глыбі Белавежскай пушчы ўзніклі леснічоўкі для дагляду за лесам. У гэтых леснічоўках найчасцей жылі па дзве сям'і. Пасля паволі пачала павялічвацца колькасць жыхароў побач леснічовак і ўзніклі вёскі. У Мацкевічах жылі спачатку сем'і Мацкевічаў і Вапаў, а ў Вілюках паселены былі Вілюкі і Саевічы. Нашчадкі Вапаў, што жылі ў нашай вёсцы, яшчэ доўга былі леснікамі. Калі ў 1939 годзе прыйшлі саветы, то вывезлі апошняга лесніка Вапу ў Сібір. Іншыя сем'і Вапаў, якія займаліся сельскай гаспадаркай, засталіся жыць у Мацкевічах. Пры Пілсудскім нашу вёску афіцыйна пачалі называць Доўгі Брод, — успамінае Васіль Хмара.

Апошнім часам пусцеюць вёскі распаложаныя паабапал мяжы ў Белавежскай пушчы.

— Яшчэ не так даўно ў нашай вёсцы жыло каля шасцідзесяці асоб. Зараз засталося толькі 27 чалавек, у асноўным старэйшыя асобы. Раней вельмі многа асоб працавала ў лесе. Зараз да лясных работ амаль не патрабуюць людзей. Толькі адзін жыхар нашай вёскі працуе ў лесе з пілой. З гаспадаркі даход невялікі. У нас засталося двух гаспадароў — Толік Вапа і Пятро Грыцюк, у якіх большыя гаспадаркі. Гадуюць яны яшчэ кароў і па некалькі цялят, — кажа мой суразмоўца. У вёсках, што знаходзяцца недалёка ад мяжы ў Беларусі, таксама хутка меншае колькасць жыхароў. Дзеці калгасных работнікаў выехалі жыць у гарады.

Аляксей Мароз

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 220 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2005 r. upływa 5 września 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Генатып

Прафесар сельскагаспадарчых навук Іван Юрыч з Заграба правёў даследаванне генетычнага паходжання харватаў. Дайшоў ён да высновы, што харваты пасяліліся на іх сённяшняй тэрыторыі восем тысяч гадоў таму, прывандраваўшы з Блізкага Усходу. Да гэтай пары некаторыя вучоныя адстойвалі тэорыю, што яны на тэрыторыю цяперашняга месцапрабывання звалакліся ў VII стагоддзі н.э. з Ірана, Ірака і Індыі ды дасяліліся да славян; гэтая тэорыя цяпер навукова абвержана. Чалавечыя гены на золаку вякоў праходзілі мутацыю і харвацкі генатып Eu7 узнік 27 тысяч гадоў назад, больш-менш у перыяд засялення Еўропы. І вось на аснове даследавання храмасомаў прафесар Юрыч высветліў, што з тытульнымі нацыямі згаданых раней краін у харватаў толькі 16% падабенства, затое ж падабенства са славянамі, у якіх генатып Eu19 — такі ж, як у венграў — у харватаў амаль удвая больш, бо 29%! На такі вынік паўплывала праніканне славян з поўначы. Усё такі ж іранцы адлюстравалі на харватаў свой уплыў: менавіта харвацкі герб з чырвонымі і белымі палямі ды слова „бан" — персідскага паходжання! Найбольшы адсотак харватаў з чыстым генатыпам Eu7 пражывае ў Далмацыі.

Вось адно столькі сціплых звестак ад вынікаў перадавой працы заграбскага вучонага ўдалося мне знайсці ў сродках масавай інфармацыі. А шкада, бо даследаванне наватарскае і мае перспектыўную практычную будучыню, прынамсі ў Харватыі. Ды добра было б, каб і нашы мічурынцы асвоілі гэтую навуковую галіну. Магчыма, што прафесар Юрыч устанавіў ужо генатып беларусаў і ягонае мінулае ды падабенства харватаў з намі. Але не гэта мне найцікавейшае, і не найцікавейшае падабенства беларусаў з харватамі. Цікава, вось, генатыпы якіх нацый паявіліся ў перыяд мамантаў, а якія ў перыяд брантазаўраў. І хто сярод іх „старэйшы брат": гэта таіць у сабе парасткі неблагой навуковай рэвалюцыі! Бо па ўсім відаць, што геадэзічныя меткі межаў сваёй тэрыторыі беларусы стаўлялі ў даледавіковы перыяд, абводзячы імі, так як гэта ўсімі генатыпамі прынята, басейн нейкага вадаёма. А вось ледавік на тым месцы сфармаваў водападзел, раскліноўваючы першабытную нашу вотчыну. І гэта неабвержны доказ, што мы, беларусы, даледавіковыя і з'яўляемся старэйшымі братамі насельнікам басейнаў Нямунаса, Дніпра, Даўгавы, Волгі і Віслы!

Менш цікавае з практычнага пункту гледжання згаданае раней наша падабенства з іншымі нацыямі. Бо што з таго, калі, напрыклад, і ў нас 29% падабенства са славянамі ды 16% падабенства з іранцамі? Гэтага разам будзе 45%. А вось несумненнае наша вялікае падабенства з індзейцамі, якія штолета стаўляюць свае вігвамы за Беластокам з боку Гарадка; мяркую пра гэта не толькі на аснове прозвішчаў тых заакіянцаў. Мы нават больш індзейскія за іх, бо яны толькі чырвонаскурыя, а мы ж — як амаль паўсюдна гаворыцца — зусім чырвоныя. Нават вочы чырвоныя: тым чырванейшыя, чым далей на ўсход... Калі яшчэ далічыць да ўсяго гэтага падабенства са скіфамі і яцвягамі, тады з іншапляменцамі ў валавым падліку набярэцца яго сто працэнтаў. І колькі астанецца падабенства з самімі намі, з беларусамі? Апасаюся, улічваючы яшчэ нашу генетычную старшабрацкую ўстарэласць, што не хопіць яго для вываду нейкай пароды з чыста беларускім генатыпам. **(івар)**

Фота БАГУСЛАВА СКОКА

Басовішча — 22-23 ліпеня 2005

Адборачны тур „Басовішча 2005" у Беларусі прэтэндаваў стаць самым зорным.

У праграме фэсту, які прайшоў 22 чэрвеня ў клубе „Акварыум" у Мінску (вул. Кульман, 14), удзельнічалі рэальныя зоркі айчыннага року („Крама", „N.R.M.", „Zet", „Ulis", „B:N", „Тарпач", „Сонцаварот"), а таксама гурты, якія паспелі засведчыць сваю прысутнасць у сур'ёзным шоу-бізнесе, якія маюць за плячыма ўдалыя прэзентацыі сваіх альбомаў ды рэцэнзіі ў сур'ёзнай прэсе — „Tesaurus", „Камаедзіца", „Imprudence", „Zigzag", „З.Ь.М.Я.Я.".

Зацятыя прыхільнікі татальна неверагодных адкрыццяў, шмат надзеяў ускладалі на такія гурты як інды-рокавы „Парасон", гранджавы „Крок", поп-рокавы „Іншыя". Канчатковыя вынікі здзіўляюць, як правіла, нават саміх арганізатараў. Дарэчы, гурты, якія па нейкіх прычынах не трапілі на конкурсную частку, маюць магчымасць выступіць на вольнай сцэне „Басовішча".

http://news.tut.by/culture/54357.html

Адгаданка



1. сюжэт, які прысніўся ноччу, 2. горад з Ягелонскім універсітэтам, 3. бязвыхадная пагроза каралю ў шахматнай партыі, 4. яечня з разбоўтаных з малаком і мукой яек, 5. выраст з касцявога рэчыва на чэрапе некаторых жывёл, 6. вялікая колькасць або матэматычная сукупнасць элементаў, 7. сакавіты лясны плод, 8. вялікі вадаём або радзіма Віктара Шведа, 9. чарадзей, 10. адзінка электрычнага супраціўлення, 11. калючая садовая кустовая расліна з кісла-салодкімі буйнымі ягадамі, 12. вялікая рака ў экватарыяльнай Афрыцы, 13. грызун, што сядзіць пад венікам, 14. лёгкае паліто, пераважна непрамакальнае, 15. расійскі губернскі горад між Ліпецкам і Пензай, 16. паншчына, заснаваная на прыгонным праве. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — народная прыкмета.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 20 нумара

Агіда, бацька, Бухара, вецер, вечa, зубы, рэха, Столін, тынк, уступ.

Рашэнне: **Каб на агурках не было пустацвету, трэба садзіць іх увечары.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Валянціне Марціновіч** з Краснага Сяла і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

26.06 – 2.07

Баран (21.03. — 19.04.) Больш увагі прысвеціш кантактам з бацькамі, роздумам над каранямі, спадчынай і ўсім, што стварае тваю індывідуальнасць. Калі тое, да чаго ты дайшоў, не задавальняе цябе эмацыянальна, і так усё, што дастанеш на паверхню, у выніку давядзе да карысных змен.

Бык (20.04. — 20.05.) Пазнаеш новыя асобы, якія, можа, не перапрываюць спроб часу, але памогуць табе асвяжыць тваю сістэму каштоўнасцей, будуць схіляць да талерантнасці і адкрытасці на новыя трэнды.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Забудзь аб руціне штодзённасці. Пачатак вельмі карыснага перыяду ў прафесійным жыцці, хопіць толькі адкрывацца на прапановы. Шмат уражанняў у пачуццях, малавата часу на ўзгадоўванне пастаяннага і моцнага.

Рак (22.06. — 22.07.) Шмат свабодных Ракаў захоча наладзіць сям'ю. Некаторыя адчуюць патрэбу змен у існуючых парах, хоць боязна. Пара адкрыцца на новыя магчымасці.

Леў (23.07. — 22.08.) Можаш адчуць паслядоўнасці ранейшых рашэнняў. Упэўніся, што стаіш моцна на зямлі, а тады бярыся за рэалізацыю новых мэт. У сямейным коле могуць разгарэцца размовы аб фінансах.

Дзева (23.08. — 22.09.) Патрэба інтэнсіўнай, цяжкай працы. Могуць разбуяць хатнія канфлікты. Атмасфера нервовасці, захуткі тэмп жыцця павялічаць твой унутраны неспакой і раздражненасць. Корпайся ў зямлі для паправы настрою.

Шалі (23.09. —22.10.) Захочаце ўзмоцніць свой аўтрытэт і прэстыж — гэта апошняя хвіліна з двухгадовага поспеху ў гэтых справах, калі вам яшчэ гэта не ўдалося. Дні карысныя для навукі і далёкіх падарожжаў. Добрыя рады і пажаданні ад іншых. Хочацца свет бачыць у адных светлых колерах.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Новае каханне ці ажыўленне ў пачуццях дазволяць бачыць свет у файных колерах. Магчымае заканчэнне спрэчак з супольнікамі ў інтарэсах. Моцны бок — умеласць слухаць іншых і патрэба дзяліцца сваімі пачуццямі. Знойдзеш адпаведныя словы, каб распаліць агонь у сталай пары.

Стралец (22.11. — 21.12.) Вер у сябе і ў свае ўявы, тады зрэалізуюцца твае мары і планы. Сустрэчы з сябрамі мілыя і карысныя. Глядзі на супрацоўнікаў, ці і яны трымаюцца тваіх прынцыпаў.

Казярог (22.12. — 19.01.) Можаш выказацца метадычнасцю і працавітасцю, большай крэатыўнасцю, што можа прынесці вынікі. Сканцэнтруйся на сваіх добрых баках. З-за заняткаў замала паказваеш пачуцці да сваіх блізкіх. Пацікаўся неканвенцыянальнай медыцынай.

Вадалей (2.01. — 18.02.) Творчая экспрэсія, ахвота да гулянак, пошукаў цікавых размоўцаў. Самотныя Вадалеі могуць страціць галаву, а калі яе аднойдуць, невядома. Поспехі ў асоб з мастацкага кола.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Рыбы вядомыя з ахвоты аддавацца справе і цярплівасці да абмежаванняў. Цяпер ужо гэтага зашмат, актыўна заманіфестуеце сваё права на свабоду і ўласныя ідэі! Вашы дзеянні прынясуць радасць і задавальненне ды павагу да самога сябе.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960